ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КРАСАВІКА 2014 г. ЧАЦВЕР № 66 (27676) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Навошта праграмісту «Ў»?**



**Карэспандэнт «ЧЗ» папрацавала экскурсаводам у музеі**



**Ганна Хітрык: кожным словам даражу**

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Цалкам аплачваць паслугі па газа- і электразабеспячэнні беларусы, як плануецца, пачнуць з 2015 года. Усё астатняе будзе аплачвацца насельніцтвам арыенціровачна на 60%. Сёння жыльцы пакрываюць прыкладна 28% рэальнага кошту камунальных паслуг. У Беларусі прыняты дакладныя крытэрыі росту тарыфаў на ЖКП. Па даручэнні Прэзідэнта вызначана $5 плюс індэксацыя ў залежнасці ад змянення цэн. Карэнных змен, акрамя $5, не адбудзецца. Наша задача — зняць лішнія выдаткі, якія не павінны адносіцца на сабекошт паслуг».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 13° |
| Віцебск | + 5° |
| Гомель | + 5° |
| Гродна | + 8° |
| Магілёў | + 5° |
| Мінск | + 5° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9920,00 | ▲ |
| Еўра | 13680,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 277,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 835,02 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ВІКІНГІ З ПАНЯМОННЯ



Фота БЕЛТА.

*У Лідскім раёне з'явіцца музей вікінгаў пад адкрытым небам. Музей ствараюць тры маладыя энтузіясты на беразе Нёмана паблізу аграгарадка Бярозаўка. Перыяд, які цікавіць стваральнікаў аб'екта,— IX — XII стагоддзі, або так званая эпоха вікінгаў. На ўчастку паблізу вады яны аднаўляюць побыт плямёнаў балтыйскага этнасу, якія пражывалі ў беларускім Панямонні ў гэты час.*

■ На свае вочы

## «АТРЫМЛІВАЙЦЕ ГРОШЫ ЗА ТУРЫЗМ!»

### АБО ЯК ЛІТОЎЦЫ ДЛЯ СЯБЕ БЕЛАРУСЬ АДКРЫВАЛІ

**У рамках праекта «Прасоўванне турызму праз павышэнне інфармаванасці пра гісторыю і культуру рэгіёнаў» на Гродзеншчыне і Міншчыне пабывала дэлегацыя з Літвы — навукоўцы, работнікі турыстычнага бізнесу, уладальнікі аграсядзіб. За «круглым сталом» яны абмяняліся з беларускімі калегамі думкамі наконт супрацоўніцтва ў турыстычнай галіне.**

### Падарожжы і эканоміка

На жаль, пераважная частка нашых суседзяў-літоўцаў ведае Беларусь у асноўным па аўтазаправачных станцыях, дзе яны запаўняюць бакі аўтамабіляў таннейшым, чым у іх, палівам. Што, зразумела, адпавядае асабістым інтарэсам гэтых людзей, але супярэчыць эканамічным інтарэсам іх дзяржавы. Магчыма, для падобнай катэгорыі «турыстаў» (гэта тычыцца і нашых землякоў — «чаўнакоў») іншага і не трэба.

СТАР. 4



**У Лідскім замку.**

■ Жыллё

## ЗНІЖКІ ПА СІСТЭМЕ ІПАТЭЧНАГА КРЭДЫТАВАННЯ

### У красавіку адзін з чатырох банкаў, якія цяпер выдаюць крэдыты на жыллё, знізіў працэнтныя стаўкі

**На гэты раз адзначыўся Белгазпрамбанк, які з першых дзён месяца знізіў стаўкі па крэдытах на нерухомасць на 4–5 працэнтаў. Адразу ўдакладню, што ў гэтай фінансавай установе распрацаваны і дзейнічаюць дзве праграмы жыллёвага крэдытавання: «Новабудоўля» (пад будаўніцтва кватэр у шматкватэрных дамах) і «Навасёлы» (на набыццё жылля).**

Істотныя зніжкі па стаўках Белгазпрамбанка пачынаюць працаваць па сістэме так званага іпатэчнага крэдытавання. Тут маюцца на ўвазе ўмовы, калі забеспячэннем па пазыцы выступае непасрэдна сам аб'ект нерухомасці, які трапляе пад залог атрыманых грошай. Цяпер з моманту атрымання грошай і да прадастаўлення ў банк дагавора аб іпатэцы кліенту прыйдзецца плаціць 42,5% гадавых. А вось пасля рэгістрацыі ўсіх дакументаў карыстанне грашыма стане танней на два працэнты — 40,5% гадавых. У гэтым выпадку банк згодны прафінансаваць да 70% кошту жылля. Падобныя іпатэчныя крэдыты банк выдае на 15 гадоў. Плаціць па рахунках трэба штомесяц роўнымі долямі. Тут прадугледжваецца магчымасць прадастаўлення адтэрміноўкі пагашэння асноўнага доўгу па крэдыце да 12 месяцаў.

З другой паловы сакавіка аднавіў жыллёвае крэдытаванне і БПС-Ашчадбанк. Цяпер тут спецыялісты банка прапануюць два крэдыты на куплю і будаўніцтва нерухомасці. Гэта — «Класічны» па стаўцы ад 43,5 да 45,5% гадавых і «Будуем дом разам» — ад 43,5% да 44%.

СТАР. 3

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

***11 красавіка 2014 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца чарговае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.***

■ Па законах эканомікі

# ЗА РЫНАК ТРЭБА ЗМАГАЦЦА

**Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КАБЯКОЎ, наведваючы ААТ «Алеся», паведамляе БЕЛТА.**

Праблема недастатковага аб'ёму продажаў характэрная для шэрагу прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам», куды ўваходзіць і ААТ «Алеся», канстатаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Праведзена сур'ёзная мадэрнізацыя, набыта якаснае абсталяванне, ёсць кваліфікаваны персанал. «Але ў наяўнасці праблема продажаў. Рынак так уладкаваны, што за яго трэба змагацца. На тэрыторыі Беларусі сышліся тавары лёгкай прамысловасці з усіх краін свету. Мы павінны разумець, што без нармальнай сістэмы продажаў, дакладнай працы з таваправоднай сеткай выніку не будзе, — сказаў Андрэй Кабякоў. — Трэба зрабіць так, каб тавары прадаваліся, забяспечыць адпаведнае функцыянаванне абсталявання, нарасціць аб'ёмы вытворчасці і атрымаць належную зарплату».

Тавары беларускай лёгкай прамысловасці карыстаюцца попытам, яны высокай якасці. «Самае тонкае месца — продаж, у гэтай сферы павінны працаваць лепшыя кадры», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Пры гэтым гатовага рэцэпту вырашэння праблемы няма. «Як варыянт, можна ўдасканаліць сістэму продажаў у гандлёвых пунктах, каб прадаўцы былі больш зацікаўлены ў рэалізацыі прадукцыі прадпрыемства», — прапанаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Андрэй Кабякоў таксама паведаміў, што працэнтныя стаўкі па крэдытах будуць паступова прыходзіць у нармальны стан. Паводле яго слоў, намаганні ўрада і Нацыянальнага банка накіраваны на тое, каб макраэканамічная палітыка, якая прадугледжвае зніжэнне інфляцыі, спрыяла стабілізацыі інфляцыйных працэсаў у краіне. Нацбанк прыняў рашэнне з 16 красавіка знізіць стаўку рэфінансавання да 22,5%. «Вельмі разлічваем, што гэта акажа пэўнае рэгулюючае ўздзеянне на рынак крэдытаў і дэпазітаў. Ненармальна, што існуе такі разрыў у працэнтных стаўках. Усё павінна прыходзіць у рынpoints адпаведнасць, раўнавагу, тэндэнцыі да гэтага вызначыліся», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. ■

# РЭСПУБЛІКАНСКІ СУБОТНІК ПРОЙДЗЕ 12 КРАСАВІКА

**Рабочую групу па яго падрыхтоўцы і правядзенні ўзначальвае намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК, паведамляе БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

У сувязі са святкаваннем 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і абвяшчэннем 2014 года Годам гасціннасці рэспубліканскім органам дзяржкіравання і іншым дзяржаўным арганізацыям, падпарадкаваным ураду, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, іншым арганізацыям рэкамендавана на добраахвотнай аснове правесці 12 красавіка рэспубліканскі суботнік на рабочых месцах або ажыццявіць добраўпарадкаванне і прывядзенне ў належны стан мемарыяльных комплексаў, помнікаў, месцаў баявой і воінскай славы, пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона.

Грашовыя сродкі, заробленыя на працоўных месцах у дзень рэспубліканскага суботніка, у аб'ёмах, вызначаных добраахвотна работнікамі, пералічваюцца праз раённыя і гарадскія выканаўчыя камітэты ў аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам. Палову гэтых сродкаў аблвыканкамы і Мінгарвыканкам пакінуць у сваім распараджэнні і накіруюць на рамонт, рэканструкцыю, рэстаўрацыю, аднаўленне і добраўпарадкаванне мемарыяльных комплексаў, помнікаў, месцаў баявой і воінскай славы, пахаванняў часоў ВАВ, а таксама на падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона, у тым ліку на развіццё і ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Другая палова заробленых сродкаў будзе накіравана Міністэрству аховы здароўя для будаўніцтва Рэспубліканскага цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі на базе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Александрава.

Пры ўдзеле ў рэспубліканскім суботніку некамерцыйных арганізацый па рашэнні калектываў работнікаў гэтых арганізацый грашовыя сродкі могуць пералічвацца ў памерах, вызначаных добраахвотна самімі калектывамі, у адпаведнасці з парадкам, што ўстанаўліваецца Мінфінам. Утрыманне наймальнікамі грашовых сродкаў з заработнай платы работнікаў, для якіх 12 красавіка з'яўляецца працоўным днём, адбываецца з іх згоды ў памерах, вызначаных добраахвотна калектывамі работнікаў.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НА МІНШЧЫНЕ ЎМЕЮЦЬ ЭКАНОМІЦЬ

**Па выніках заключнага этапу VII рэспубліканскага конкурсу праектаў па эканоміі і беражлівасці «Энергамарафон-2013», што адбыўся ў Баранавічах, адзначаны ўстановы і педагогі Міншчыны.**

У намінацыі «Лепшы практычны цэнтр (музей) па энергазберажэнні дыпломам І ступені ўзнагароджаны калектыў абласнога музея «Эвалюцыя энергазберажэння» Мар'інагорскай гімназіі. Дыплом ІІІ ступені ў намінацыі «Лепшы педагагічны работнік па арганізацыі работы па выхаванні культуры энергазберажэння навучэнцаў» атрымаў Аляксандр Савянок — настаўнік фізікі гімназіі № 6 г. Маладзечна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ПАДАРУНАК ДЛЯ ФІЛАТЭЛІСТАЎ І АМАТАРАЎ ПОСТКРОСІНГУ

**...зрабіў Магілёўскі філіял «Белпошты». Падчас святкавання Дня посткросера ў памяшканні Галоўпаштамта па вуліцы Першамайскай адкрылася паштовая лаўка «Штэмпель».**

— Гэта зроблена для тых, хто захапляецца гэтай цікавай справай, — адзначыла **намеснік дырэктара Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна МАРЧАНКА.** — Раней ім прыходзілася стаяць у агульнай чарзе, а гэта нязручна. Тым больш, тут хутчэй можна будзе знайсці сабе сябра па інтарэсах.

Да паслуг наведвальнікаў спецыялізаванай крамы шырокі асартымент паштовых картак, марак і канвертаў «першага дня». Філатэлісты маюць магчымасць заказаць тут беларускія маркі, якія выпускаліся з пачатку 1990-х гадоў. Пры ўмове, што яны ёсць у наяўнасці.

У рамках мерапрыемства былі ўзнагароджаны пераможцы конкурсу «Лепшая паштовая марка Рэспублікі Беларусь-2013». На Магілёўшчыне імі сталі 13 чалавек. У якасці падарунка яны атрымалі тэматычныя наборы марак і канвертаў са спецгашэннем.

Дарэчы, лепшай па выніках мінулага года стала паштовая марка «1025 гадоў Хрышчэння Русі», на другім і трэцім месцах «Беларускія анімацыйныя фільмы» і «400-годдзе прыбыцця цудатворнага абраза Божай Маці ў Будслаў», адпаведна.

Аматары посткросінгу мелі магчымасць у гэты дзень скарыстацца зніжкай пры перасылцы паштоўкі. Як запэўніла кіраўніцтва магілёўскага філіяла «Белпошты», такую льготу можна будзе атрымліваць і далей адзін раз у квартал.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## КРОПКУ ПАСТАВІЦЬ СУД

**Для разгляду ў Гомельскі абласны суд перададзена крымінальная справа па факце жорсткага забойства 31-гадовага жыхара Лельчыц.**

У прэс-службе ўпраўлення СК Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці нагадалі, што летась у кастрычніку пасля продажу свайго аўтамабіля ў Жыткавічах раптоўна знік малады мужчына. Жонка, з якой ён не выходзіў на сувязь, падала заяву ў мясцовы аддзел унутраных спраў. Сумесная карпатлівая работа супрацоўнікаў Следчага камітэта, міліцыі і Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз прывяла да высвятлення ўсіх акалічнасцяў трагедыі. Пасля таго, як у Жыткавічах аўтамабіль «Mitsubishi Carisma» быў прададзены, пацярпелы папрасіў двух жыхароў Лельчыц падвезці яго да дому. 22-гадовыя хлопцы прапанавалі абмыць продаж і вывезлі земляка ў лес, дзе жорстка збілі. Па заключэнні судова-медыцынскай экспертызы, смерць наступіла ад шматлікіх траўмаў галавы. Пераканаўшыся, што спадарожнік мёртвы, зладзеі прысвоілі $4800. Для ўтойвання слядоў злачынства труп адвезлі ў лясны масіў каля вёскі Кольна ў Жыткавіцкім раёне і кінулі ў канаву. З улікам ацэнкі сабраных доказаў зламыснікам прад'яўлена абвінавачванне ў разбоі, учыненым групай асоб з мэтай завалодання маёмасцю ў буйным памеры, з прычыненнем цяжкага цялеснага пашкоджання, а таксама ў забойстве, здзейсненым з асаблівай жорсткасцю.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## КРАСАВІЦКАЯ НАВАЛЬНІЦА З НАСТУПСТВАМІ

**Ад удару маланкі ў Лельчыцах загарэўся жылы дом.**

Начная навальніца з грымотамі і маланкамі прынесла ў адзін з самых паўднёвых райцэнтраў краіны трывогу. Многія мясцовыя жыхары не спалі ўсю ноч. На пачатку трэцяй у адзін з дамоў па вуліцы Піянерскай трапіла маланка. Уладальнік пачуў пах падпаленай праводкі і выбег з жонкай на вуліцу. Сям'я ўбачыла, што дах ахоплены агнём. Выратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, затушылі пажар. Ад яго, на шчасце, ніхто не пацярпеў. А вось дах дома давядзецца рамантаваць капітальна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



■ Меркаванне

# НЕБЕСПАДСТАЎНАЕ СТАРШЫНСТВА

**Як вядома, пасля падзей у сакавіку 2014 года ў сувязі з Крымам украінскі бок заявіў аб тым, што разглядае пытанне аб выхадзе з СНД. Натуральна, што ў такой сітуацыі Кіеў не зможа эфектыўна ажыццяўляць запланаванае на 2014 год старшынства ў гэтай арганізацыі. У выніку пазачарговае старшынства ў СНД прыняла на сябе Беларусь. Трэба адзначыць, што ў 2013 годзе таксама меркавалася старшынства Украіны ў СНД, але па просьбе прэзідэнта Януковіча яно было перанесена на 2014 год.**

Для прыняцця на сябе такіх адказных функцый у Беларусі ёсць сур'ёзныя падставы. Перш за ўсё адзначым, што сваю ролю адыграла паспяховае ажыццяўленне Беларуссю функцый старшыні арганізацыі ў 2013 годзе. Усе запланаваныя мерапрыемствы (больш як 70 летась) былі праведзены зладжана і на высокім узроўні.

Старшынства ажыццяўлялася пад дэвізам «Інтэграцыя на карысць чалавека: умацаванне добрасуседства, развіццё экалагічнага супрацоўніцтва, садзейнічанне павышэнню даступнасці экалагічных «зялёных» тэхналогій, пашырэнне дыялогу культур». Беларускае старшынства спрыяла паэтапнай рэалізацыі дагавора аб зоне свабоднага гандлю, інавацыйнае супрацоўніцтва краін СНД было напоўнена канкрэтнымі праектамі. Па ініцыятыве нашай краіны было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне аховы навакольнага асяроддзя.

2014 год адказны для СНД і з прычыны праблем, якія чакаюцца з-за вываду амерыканскіх войскаў з тэрыторыі Афганістана. Падчас пасяджэння Савета міністраў замежных спраў СНД 4 красавіка 2014 года міністры дамовіліся аказаць сістэмную дапамогу Таджыкістану ў справе ўмацнення памежнай бяспекі на таджыкска-афганскай мяжы. Патэнцыяльныя праблемы ў Афганістане пагражаюць стабільнасці і ў іншых краінах Цэнтральнай Азіі, што выклікае неабходнасць у грамадзянскай каардынацыі работы СНД у гэтым кірунку. Мінск, як месца сканцэнтравання цэнтральных органаў СНД, зможа гэтым займацца.

На жаль, нельга не адзначыць і абвастрэнне праблем ва Украіне. Беларускае старшынства зручнае тым, што Беларусь як суседка гэтай краіны здольная прыняць больш кампетэнтныя рашэнні па наладжванні расійска-ўкраінскіх адносін і ўтрыманні Украіны ў СНД. Будзем спадзявацца, што ў выніку беларускіх намаганняў пры падтрымцы іншых членаў арганізацыі Кіеву ўдасца прыняць узважаныя рашэнні для ліквідацыі гэтых праблем і захаваць сваё членства ў СНД.

Добра ўпісваецца беларускае старшынства сёлета і ў кантэксце аб'яўлення гэтага года Годам гасціннасці. Як вядома, у Беларусі ў красавіку адкрываецца шмат новых атэляў, а ў маі наша краіна прыме чэмпіянат свету па хакеі.

Несумненна, будуць рэалізоўвацца і іншыя задачы. Як адзначыў 4 красавіка 2014 года кіраўнік МЗС Беларусі Уладзімір Макей, Беларусь працягне рэалізоўваць канцэпцыю свайго мінулагодняга старшынства, а таксама будзе выкарыстоўваць прапановы, якія змяшчаліся ва ўкраінскай канцэпцыі старшынства ў СНД.

Адзначым, што ва ўкраінскай канцэпцыі прадугледжвалася рэалізацыя прыярытэтных задач па шасці кірунках. Амаль усе яны актуальныя і для Беларусі. Ва ўмовах павышаных геапалітычных рызык, безумоўна, будуць актуальны намечаныя Украінай задачы па садзейнічанні рэалізацыі міждзяржаўных праграм па супрацьдзеянні тэрарызму і іншым

**Беларускае старшынства зручнае тым, што Беларусь як суседка Украіны здольная прыняць больш кампетэнтныя рашэнні па наладжванні расійска-ўкраінскіх адносін і ўтрыманні Украіны ў СНД.**

гвалтоўным праявам экстрэмізму (на 2014–2016 гг.), барацьбе з гандлем людзьмі (на 2014–2018 гг.), барацьбе са злачыннасцю (на 2014–2018 гг.), барацьбе з незаконным абаротам наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў і супрацьдзеянні наркаманіі (на 2014–2018 гг.), а таксама актывізацыя дзейнасці адпаведных галіновых органаў.

Значэнне могуць мець і мерапрыемствы па актывізацыі шматбаковага дыялогу з партнёрамі па Садружнасці па пытаннях транспарціроўкі энергарэсурсаў, забеспячэння бяспекі і надзейнасці іх паставак, выпрацоўкі зразумелых і дакладных прынцыпаў дзейнасці дзяржаў-удзельніц на міжнародным рынку энерганосьбітаў.

Можна таксама смела разлічваць і на тое, што Беларусь будзе старанна каардынаваць выкананне плана асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да святкавання 70-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў.

Апроч гэтага, кіраўнік МЗС Беларусі адзначыў 4 красавіка, што Беларусь будзе садзейнічаць умацаванню добрасуседскіх адносін на прасторы Садружнасці, надаваць вялікую ўвагу эканамічнаму вымярэнню ў рамках інтэграцыйных працэсаў на прасторы СНД, выкананню адпаведнага дагавора аб зоне свабоднага гандлю.

Будуць таксама праводзіцца значныя мерапрыемствы ў культурнай сферы. Дарэчы, у арганізацыі аднаго з іх — форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі — Беларусі вызваўся дапамагчы Казахстан, прапанаваўшы правесці яго на сваёй тэрыторыі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

# ЗНІЖКІ ПА СІСТЭМЕ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Галоўнае адрозненне крэдыту на нерухомасць БПС-Ашчадбанка ад аналагічных фінансавых прадуктаў канкурэнтаў у тым, што для разліку максімальнай сумы пазыкі тут бярэцца не толькі заробак аднаго заяўніка, а сукупны даход сваякоў першай лініі (мужа, жонкі, дзяцей, бацькоў і дзядуль з бабулямі). Максімальная сума пазыкі залежыць ад спосабу забеспячэння па крэдыце. У выпадку паручыцельства фізічных або юрыдычных асоб можна разлічваць на крэдытаванне да 80% кошту жылля, але не больш за 150 тысяч долараў у эквіваленце.

Аднак самыя танныя крэдыты на будаўніцтва жылля пад 38,5% гадавых сёння працягвае выдаваць Беларусбанк. Камерцыйны крэдыт выдаецца на 15 гадоў і павінен прафінансаваць да 75% кошту будучай кватэры. Аднак тут існуе адзін вялікі мінус, бо максімальная сума крэдыту разлічваецца толькі з даходу аднаго заяўніка.

Сёлета Беларусбанк запланаваў сабе шырокую праграму па выдачы розных жыллёвых крэдытаў. Усяго на жыллёвае будаўніцтва плануецца накіраваць 14,356 трлн рублёў, з іх льготных крэдытаў — 13,613 трлн, а на ўмовах банка — 743 мільярды рублёў.

Толькі на будаўніцтва жылля выдае грошы Белаграпрамбанк. Кліенты могуць разлічваць на суму ў 90% ад цаны будаўніцтва пад 45%. Тэрмін крэдытавання складае да 20 гадоў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Максімальная сума крэдыту знаходзіцца ў межах крэдытаздольнасці заяўніка, але не можа перавышаць 500 мільёнаў рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ОАО «Белбакалея»

УНП 100025653

**извещает, что 25 апреля 2014 года в 14.00**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОВМЕСТНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «Белбакалея» и ОАО «Белторгстрой»**
**по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал.**
**Регистрация участников собрания с 13.00.**
**При себе иметь документ, удостоверяющий личность.**

**Повестка дня:**

1. Об утверждении передаточного акта в связи с присоединением к ОАО «Белбакалея» ОАО «Белторгстрой».
2. Утверждение решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Белбакалея».
3. Об увеличении уставного фонда ОАО «Белбакалея» на сумму дополнительного выпуска за счет имущества ОАО «Белторгстрой».
4. Утверждение изменений в устав ОАО «Белбакалея».
5. Утверждение порядка размещения акций дополнительного выпуска среди акционеров ОАО «Белторгстрой».
6. Утверждение изменений в проспект эмиссии ОАО «Белбакалея».

*Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея»*

■ Да ведама

# ЧЫГУНКА ЎВОДЗІЦЬ ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

**Больш за 80 дадатковых цягнікоў будуць курсіраваць па Беларускай чыгунцы ў дні красавіцкіх і майскіх святаў. Усяго ў перыяд з 26 красавіка па 11 мая прызначана 30 цягнікоў міжрэгіянальных ліній і 54 цягнікі міжнародных ліній, інфармуе прэс-цэнтр магістралі. Прычым работа па прызначэнні дадатковых цягнікоў на перыяд свят, а таксама па выхадных днях будзе прадоўжана.**



Фота БЕЛТА.

У міжрэгіянальных зносінах будзе курсіраваць дадатковы цягнік №679/680 Гомель — Мінск, які адпраўляецца з Гомеля ў 15.27 і прыбывае ў Мінск у 19.05. Гэты цягнік прызначаны на 28 красавіка, 1 і 8 мая. У святочны перыяд таксама будуць хадзіць дадатковыя цягнікі міжрэгіянальных ліній № 632 Мінск — Гомель (28 красавіка і 2 мая), № 638 Мінск — Калінкавічы — Гомель (28 красавіка і 8 мая), № 693 Мінск — Полацк (28 красавіка), № 671/672 Мінск — Брэст — Мінск (1 мая) і іншыя.

У міжнародных зносінах Беларуская чыгунка разам з расійскімі партнёрамі дадаткова прызначыла цягнікі па найбольш запатрабаваных маршрутах: Брэст — Масква — Брэст, Мінск — Масква — Мінск, Брэст — Санкт-Пецярбург — Брэст і іншых. Акрамя таго, у святочны перыяд па Беларускай чыгунцы транзітам будуць курсіраваць дадатковыя цягнікі № 148/147 Калінінград — Масква — Калінінград і № 80/79 Калінінград — Санкт-Пецярбург — Калінінград.

Больш падрабязную інфармацыю аб прызначэнні дадатковых цягнікоў і часе іх адпраўлення можна атрымаць на сайце Беларускай чыгункі, а таксама ў чыгуначных касах і па тэлефонах даведачных службаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Май на ўвазе!

# НА СУСТРЭЧУ З РОДНЫМІ

## Месцы пахаванняў у адселеных вёсках будуць адкрыты для свабоднага наведвання 26–29 красавіка

**Сёлета могілкі, размешчаныя ў зоне адсялення і адчужэння Гомельскай і Магілёўскай абласцей, будуць адкрыты для свабоднага наведвання з 26 па 29 красавіка. Такая традыцыя практыкуецца штогод напярэдадні і ў дзень Радаўніцы — свята памінання продкаў, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны спецыяліст Адміністрацыі зон адсялення і адчужэння МНС Святлана НОВІКАВА.**

Гэтымі днямі наведаць месцы пахаванняў у адселеных вёсках можна будзе без спецыяльнага пропуску. Дастаткова прад'явіць пашпарт на кантрольна-прапускным пункце, а таксама дакументы на транспартны сродак пры яго наяўнасці. На ўездзе ў зону радыяцыйнага кантролю людзям будуць выдавацца памяткі аб мерах засцярогі і бяспечных паводзінах. Інфармацыя ўключае правілы абароны ад пажараў у ўмовах павышанай радыяцыі і выкананне проціпажарных патрабаванняў. Час знаходжання ў зоне будзе абмежаваны да 17.00.

Паводле слоў галоўнага спецыяліста, на дні Радаўніцы традыцыйна прыпадае пік наведвання такіх месцаў пахаванняў, якіх тут налічваецца больш за 200. Штогод сюды прыязджаюць да 12 тыс. чалавек з розных куткоў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа, якія вымушаны былі пакінуць родныя мясціны з-за аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі.

Для забеспячэння грамадскага парадку і проціпажарнай бяспекі каля могілак будзе арганізавана дзяжурства супрацоўнікаў міліцыі і падраздзяленняў МНС.

**ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

Республика Беларусь, 220007,
г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15,
(+375 33) 309 15 15

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 264 391,8 | 179 233,2 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 124 503,9 | 1 822 373,6 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 495 373,6 | 195 889,8 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 31 021,7 | 43 647,5 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 4 853 798,6 | 4 142 641,4 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 471 400,9 | 389 977,1 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 472,1 | 472,1 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 382 469,5 | 281 060,3 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 5 416,9 | 3 280,7 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 71 987,0 | 74 526,6 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 8 700 836,0 | 7 133 102,3 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 500 541,8 | 494 793,3 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 2 729 074,5 | 2 656 007,1 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 4 205 542,5 | 3 321 648,0 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 8 224,3 | 14 438,1 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 352,8 | 151,0 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 316 657,8 | 104 043,9 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 7 760 393,7 | 6 591 081,4 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 434 020,2 | 84 370,2 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | 34 320,3 | 34 320,3 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 66 891,6 | 48 891,6 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 194 354,7 | 155 871,3 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 210 855,5 | 218 567,5 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 940 442,3 | 542 020,9 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 8 700 836,0 | 7 133 102,3 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2014 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 258 830,2 | 169 830,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 160 718,1 | 115 918,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 98 112,1 | 53 912,4 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 100 339,6 | 77 584,2 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 16 906,8 | 10 437,0 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 83 432,8 | 67 147,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (5 059,2) | (12 240,8) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 23 816,9 | 6 744,4 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 63 351,9 | 3 918,0 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5 974,2 | 16 638,9 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 96 569,7 | 74 935,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 3 228,5 | 2 131,2 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 43 126,7 | 51 217,6 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 12 963,6 | 12 130,2 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 30 163,1 | 39 087,4 |

Исполняющий обязанности
Председателя Правления Д.Л. Фролов

Главный бухгалтер М.В. Дудко

Финансовая отчетность банка в соответствии с НСФО на 1 апреля 2014 года в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: **vtb-bank.by**

УНП 101165625.

■ Пад кантролем

# НЕСАПРАЎДНЫ «СЭКАНД-ХЭНД»

**Партыю абсалютна новага адзення, біжутэрыі, галантарэі і гадзіннікаў спрабавалі выдаць за былы ў карыстанні тавар прадстаўнікі літоўскай фірмы. Пра гэта паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай работы Мінскай рэгіянальнай мытні.**

У пункт мытнага афармлення «Маладзечна» тавар агульнай вагой больш за 6 тон паступіў як «сартаваныя адзенне і абутак». Таксама ў суправаджальных дакументах удакладнялася, што рэчы не новыя, а былыя ва ўжыванні.

Супрацоўнікі мытні выявілі непраўдзівасць гэтага факта: груз, што перавозіўся ў чыгуначным кантэйнеры, зусім не адпавядаў заяўленым параметрам. Так, усё адзенне было з этыкеткамі, абутак не меў прыкмет ноські. Да таго ж у кантэйнеры яшчэ аказаліся біжутэрыя, галантарэя і гадзіннікі. Паводле дакументаў, атрымальнікам грузу з'яўлялася кампанія ў Казахстане. Рэчы папярэднім коштам каля 1 мільярда рублёў канфіскавалі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■ Нашым пра вашых

# НА «БЕЛАРУСЬ-1» СТАРТАВАЎ ПРАЕКТ «ГАЛЯВАЯ ПЕРАДАЧА»

**Усяго Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі падрыхтавала 21 тэлесюжэт пра гісторыю і правілы гульні ў хакей, пра каманды-ўдзельніцы сёлетняга сусветнага першынства, прызнаных «зорных» гульцоў і лядовыя арэны, дзе пройдуць спаборніцтвы.**

Дарэчы, адна з цікавінак праекта ў тым, што пра каманды — удзельніцы ЧС-2014 раскажуць самі грамадзяне гэтых краін, як хакейныя спецыялісты і заўзятыя балельшчыкі, так і зусім звычайныя людзі, далёкія ад спорту.

Паводле слоў загадчыка аддзела спартыўных навінаў АТН Мікалая Стула, ён і яго калегі пачалі рыхтаваць «Галявую перадачу» яшчэ два месяцы таму, падчас Алімпіяды ў Сочы, дзе выступіла большасць хакейных зборных. «Атрымалася, па сутнасці, тэлевізітоўка чэмпіянату, змест якой зразумелы ўжо з назвы, — мяркуе Мікалай. — Галявая перадача ў спорце — гэта апошні пас перад кульмінацыяй матча — голам. У нашым выпадку кульмінацыя — чэмпіянат свету, да якога Беларусь рыхтавалася сем гадоў, а «Галявая перадача» — яго прадвесце. Фінішуе праект 8 мая, у гэты дзень пакажам сюжэт-прэзентацыю каманды Беларусі».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

Утерянный страховой полис ЗАСО «Белнефтестрах» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 4713975 **считать недействительным.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# «АТРЫМЛІВАЙЦЕ ГРОШЫ ЗА ТУРЫЗМ!»

Хаця нямала, напэўна, і тых, хто хоча пазнаць краіну былых «суграмадзян» па Вялікім Княстве Літоўскім, ды не атрымліваецца — з-за візавых праблем, і пасіўнасці турбізнесу. Перашкаджаюць, пэўна, і стэрэатыпы: маўляў, у суседзяў «няма нічога цікавага». Але няпраўда, ёсць! У чым і паспрабавалі пераканаць членаў літоўскай дэлегацыі беларускія прадстаўнікі сумеснага праекта.

Трэба разумець, што турызм у яго сучасным разуменні — гэта не проста падарожжы і экскурсіі, а галіна эканомікі, бізнес, які павінен прыносіць «дывідэнды» яго арганізатарам і ўдзельнікам, а таксама рэгіёну — дзякуючы не толькі цікавым турыстычным аб'ектам, імпрэзам, але і партнёрскім сувязям, што наладжваюцца, калі бачыш на свае вочы тыя ці іншыя цікавінкі. І гэты праект — не выключэнне. Напрыклад, **прафесар Балтыйскага інстытута аграбізнесу Раймундас ЛАПАТА** ўдзельнічае (як кіраўнік праектаў групы кампаній Arvi) у будаўніцтве на Лідчыне комплексу па вытворчасці прадукцыі з мяса індычкі, а таксама ў тэхнічным пераўзбраенні ўтылізацыйнага ветэрынарна-сантэхнічнага завода. А падчас апошняй турыстычнай вандроўкі ён правёў дзелавую сустрэчу на адным з нашых прадпрыемстваў — па пытанні адкрыцця іх фірменнай крамы ў Вільнюсе.

— Прадукцыя добрая, экспартныя перспектывы ў гэтага тавару някепскія, але трэба дадаць ва ўзроўні маркетынгу, — лічыць Раймундас Лапата.

Пра маркетынг, але ўжо ў дачыненні да турыстычнага прадукту, неаднойчы ўзгадвалася і падчас паездкі ўдзельнікаў беларуска-літоўскага праекта па маршруце «Гродна — Шчучын — Жалудок — Нясвіж — Мір — Навагрудак — Валеўка — Ліда — Гродна». Вядома, тут у нас яшчэ працы, як кажуць, непачаты край. Але, разам з тым, дзяліліся сваімі ўражаннямі госці з Літвы, у Беларусі шмат робіцца па захаванні і папулярызацыі сваёй гістарычнай спадчыны. Некаторыя былі ў нас упершыню і кажуць, што ўбачанае, асабліва ў Нясвіжскім і Мірскім замках, пераўзышло ўсе чаканні. Нічога агульнага з некаторымі ацэнкамі, што бытуюць у замежжы — быццам Беларусь клапоціцца толькі пра мяса і малако, а не пра сваю спадчыну. Нашы літоўскія суседзі пераканаліся ў тым, што аб'екты мінуўшчыны — гэта таксама прыярытэт беларускай дзяржавы.

Адзін з членаў літоўскай дэлегацыі засумняваўся, што турыстам трэба паказваць сядзібу Чацвярцінскіх у пасёлку Жалудок. Сапраўды, яна знаходзіцца ў такім гаротным стане, што няма адкуль узяцца станоўчым эмоцыям. Але, як патлумачыў нацыянальны кіраўнік праекта з беларускага боку, **намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі спартыўна-турысцкі саюз» Сяргей КАЛЯДА,** з гэтай гістарычнай сядзібай гасцей знаёмілі не як турыстаў, а як экспертаў — у пошуку магчымых інвестыцый у адраджэнне аб'екта:

— На Гродзеншчыне, дарэчы, ужо ёсць прыклад, калі, здавалася б, зусім занядбаны, неперспектыўны аб'ект (сядзіба «Падароск» у Ваўкавыскім раёне), прастаяўшы шмат гадоў без гаспадара, зацікавіў інвестара з Урала. У Паўла Падкарытава беларускія карані, і ён хоча стаць грамадзянінам нашай краіны.

## Сувеніры і… эмоцыі!

…Пасяджэнне «круглага стала» па абмеркаванні перспектыў супрацоўніцтва ў сферы турызму адбылося ў Лідскім замку Гедыміна. Але спачатку анімацыйная група мясцовай турфірмы «Адрас лета» паказала інсцэніроўку «Вяселле Ягайлы». За сярэднявечным сталом — вялікі князь літоўскі і кароль польскі са сваёй 17-гадовай жонкай Соф'яй Гальшанскай. Урачыстасць, якую суправаджаюць прыдворныя музыканты, вядзе маршалак. Прысутнічаюць хрышчоны бацька нявесты, ліцвінскі рыцар і яго «калега» з Каралеўства Польскага… Гучаць здравіцы «Слава каралю!», а прыслуга частуе гасцей вяселля (удзельнікаў беларуска-літоўскага праекта) каралеўскім напоем.

— Брава! Мы ўбачылі творчых людзей, якія падарылі нам добрыя ўражанні — тое, з чым мы адсюль паедзем і што потым парэкамендуем сваім сябрам і знаёмым. Раскажам, што ў Лідзе не толькі замак аднаўляецца, але ёсць і тое, што і бурліць, і чапляе за сэрца. Гэта і ёсць сучасны турызм, — такую ацэнку даў **эксперт праекта Джугас ВАЙЧУНАС.**

**На Гродзеншчыне, дарэчы, ужо ёсць прыклад, калі, здавалася б, зусім занядбаны, неперспектыўны аб'ект, прастаяўшы шмат гадоў без гаспадара, зацікавіў інвестара з Урала.**

Сапраўды, важна прапанаваць турыстам не толькі сувеніры, але і пазітыўныя адчуванні, эмоцыі. Што і робіць у Лідскім замку. Праўда, не варта спыняцца на дасягнутым. Падчас «круглага стала» аніматарам параілі распачынаць дзейства яшчэ на падыходзе да замкавай брамы, а таксама паклапаціцца пра тое, каб турыстам было зручна… развітвацца са сваімі грашыма.

— У наступны раз я хацеў бы, вобразна кажучы, устаўць у гэты капялюш сваю банкаўскую картку — каб расплаціцца за ўбачанае і адчутае. Сябры, атрымлівайце грошы за турызм, зарабляйце на гэтым, — пажадаў Джугас Вайчунас.

## Цуды — побач

— У вас ёсць што паказаць. Аднак, на жаль, мы столькі гадоў топчамся на месцы і не можам зрабіць візавы рэжым максімальна спрыяльным для турыстычных паездак. Калі чалавек чакае візу тыднямі, не ведаючы, ці ўвогуле яе атрымае, дык якая можа быць ахвота ехаць да суседзяў? — адзначае **прэзідэнт асацыяцыі гідаў Друскінінкая Таццяна ЗЯЛІНСКАЯ.**

А вось якія ўражанні засталіся ад падарожжа па Беларусі ў **прафесара Вільнюскага ўніверсітэта, даследчыка гісторыі Вялікага Княства Літоўскага Альфрэдаса БУМБЛАЎСКАСА:**

— Калі мяне ўпершыню запрасілі стварыць канцэпцыю нашага праекта, я пачаў са слоў: «Суседзі, якія стаяць спінай адзін да аднаго». На жаль, літоўска-беларуская мяжа, якой ніколі не было (бо ніколі, акрамя XX стагоддзя, не было асобных дзяржаў) пакідае пэўныя стэрэатыпы, непаразуменні. Часта мы прыгадваем з нашай агульнай гісторыі толькі яе асобныя часткі. А трэба разам тварыць тое, што нас яднае. Я здзіўляюся, чаму для літоўскіх турыстаў Гродзенская вобласць ці Нясвіж не актуальныя?! Ужо цяпер, як мы пераканаліся, там ёсць вялікія турыстычныя магчымасці, і дзеля іх выкарыстання мы, суседзі, павінны цесна супрацоўнічаць.

На што і скіраваны сумесны праект, кажа яго нацыянальны кіраўнік з беларускага боку Сяргей Каляда:

— Трэба злучаць турыстычныя суб'екты Беларусі і Літвы дзеля сумеснай работы, бо ўсім ёсць што паказаць. Як у гэтым праекце: аб'-ядналіся, з'ездзілі адзін да другога — глядзіш, нешта і атрымліваецца.



Інсцэніроўка «Вяселле Ягайлы».



Удзельнікі праекта ў Нясвіжскім замку.

**Наша даведка:**

*Партнёрамі праекта, які ажыццяўляецца па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія — Літва — Беларусь, з'яўляюцца з літоўскага боку Балтыйскі інстытут аграбізнесу, адміністрацыя муніцыпалітэта г. Друскінінкай, асацыяцыя сельскага турызму Літвы, а з беларускага — аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама і Гродзенскае абласное аддзяленне грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз». У выніку праекта будуць, у прыватнасці, створаны база даных турыстычных маршрутаў Друскінінкайскага і Гродзенскага рэгіёна на шасці мовах і прадстаўленае ў тэкставым, відэа- і аўдыяфарматах інфармацыйнае выданне «Гід па навакольных тэрыторыях гарадоў Друскінінкай і Гродна», а таксама турыстычная карта з новымі маршрутамі і звесткамі аб турыстычных аб'ектах. Акрамя таго, праект накіраваны на павышэнне кваліфікацыі прадстаўнікоў турыстычнага сектара Літвы і Беларусі шляхам абмену перадавым вопытам.*

Пачынаем адзін аднаго разумець. І адносіны ўжо іншыя — не проста суседскія, а сяброўскія.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

---

■ Напярэдадні падзеі

# СТАРАЯ ПАШТОЎКА: УРОКІ НА ЗАЎТРА

**Сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь а 16-й гадзіне пачнецца творчая сустрэча са слаўтым калекцыянерам старых паштовак Уладзімірам ЛІХАДЗЕДАВЫМ.**

Вядомасць сваю збіральнік набыў дзякуючы найперш творчаму праекту газеты «СБ. Беларусь сегодня». Дзесяць гадоў таму ў самым тыражным грамадска-палітычным выданні краіны пачалі выходзіць матэрыялы пад рубрыкай «У пошуках страчанага». Дзясяткі аўтараў расказвалі пра розныя мясціны нашай краіны, у якасці ілюстрацый да выступленняў выкарыстоўваючы рэпрадукцыі паштовак. Летапісцамі-краязнаўцамі выявілі сябе журналісты, пісьменнікі, гісторыкі, архівісты... Імёны гэтых аўтараў добра вядомы чытачам.



Ацэнкай руплівасці газеты стала высокая адзнака — Прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Уладзімір Ліхадзедаў шмат зрабіў для арганізацыі выставак старых паштовак, міжнародных філакартычных канферэнцый. Сёння рэпрадукцыі паштовак друкуюцца ў газетах «Голас Радзімы», «Звязда», «Літаратура і мастацтва», часопісах «Беларусь», «Маладосць», «Родная прырода»... Пабачыў свет добры тузін кніг у агульнай серыі «У пошуках страчанага». Паштоўка зрабілася сапраўднай крыніцай для вывучэння гісторыі нашай Айчыны.




Сталовічы. Абоз з параненымі рускімі салдатамі. 1916 г. *(З калекцыі У. Ліхадзедава).*

Павіншаваць Уладзіміра Ліхадзедава з дзесяцігоддзем праекта прыйдуць калегі па краязнаўчых пошуках, журналісты, гісторыкі, бібліятэкары, навукоўцы, грамадскія дзеячы і высокія чыноўнікі.

— У маіх планах зрабіць старую паштоўку сапраўдным складнікам у выхаванні ў нашым грамадстве любові і павагі да гісторыі, здабыткаў, здзяйсненняў нашых прашчураў, — гаворыць філакартыст Уладзімір Ліхадзедаў. — Спадзяюся, што мне гэта ў супольнасці з беларускімі масмедыя і беларускімі выдавецтвамі абавязкова ўдасца.

**Максім ЗАЗЕРКА**

■

---

■ Шануй сваё

# НАВОШТА НАМ БЕРАГ ЧУЖЫ?!

## Названы самыя папулярныя сярод турыстаў беларускія гарады

У рэйтынгу турыстычных жамчужын, як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА **дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім КАРМАЗІН,** лідзіруюць Мінск, Полацк, Брэст і Гродна. «Магілёў наведваюць менш, крыху зменшыўся прыток турыстаў у Гомель», — сказаў Вадзім Кармазін, каменціруючы турыстычную прывабнасць абласных цэнтраў.

Нягледзячы на тое, што Мінск займае ў гэтым спісе першы радок, колькасць менавіта арганізаваных турыстаў у сталіцы застаецца на адным узроўні на працягу апошніх трох гадоў. «Наадварот, у Гродзенскім, Брэсцкім і Віцебскім рэгіёнах колькасць арганізаваных турыстаў расце кожны год», — адзначаў дырэктар дэпартамента па турызме.

Найбольш папулярнымі ў названых гарадах з'яўляюцца выдатныя мясціны, звязаныя з гісторыка-культурнай спадчынай. Напрыклад, у Полацку гэта Сафійскі сабор, у Брэсце — мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», у Гродзенскай вобласці — замкі.

■

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
10 КРАСАВІКА 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 7 (15742)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



Імёны

# «ЛЕТНІЯ» ЭКСПЕРЫМЕНТЫ ГАННЫ ХІТРЫК

**Гурт S°unduk вылучаецца на фоне беларускіх музычных калектываў. Прычына, мабыць, у апантанасці яго ўдзельнікаў, нязгасным жаданні дарыць іншым якасную музыку, добры настрой і душэўнасць. Кожная іх сустрэча з аўдыторыяй — гэта палітра эмоцый, вельмі падобных да тых, калі пасля доўгай дарогі вяртаешся дадому... 14 красавіка S°unduk запрашае сваіх прыхільнікаў на беларускамоўны канцэрт, які адбудзецца на сцэне Купалаўскага тэатра. Пра падрыхтоўку да свята і творчыя пошукі размаўляем з салісткай групы, актрысай тэатра і кіно, а галоўнае шчаслівай мамай і жонкай Ганнай Хітрык.**

***— Зладзіць канцэрт у сценах роднага тэатра — сёння амаль здзейсненая мара. Калі ўзнікла ідэя і хто дапамагаў у яе ажыццяўленні?***

— У камандзе вяліся размовы пра тое, што хочам зрабіць канцэрт у Купалаўскім. І ўяўлялі яго выключна беларускамоўным. А мы ж усё-такі больш рускамоўны калектыў. Але з часам гэтай ідэяй вельмі загарэліся.

Плюс я сустрэла геніяльных, на маю думку, людзей. І таксама паверыла, што гэта знак. У мяне не хапала добрых беларускіх песень і я пайшла ў кніжную краму. Калі ўжо збіралася выходзіць, нічога асабліва не прыгледзеўшы, то заўважыла кніжку і проста па вокладцы адчула — вось тое, што мне патрэбна! У тэатры пасля рэпетыцыі разгарнула і пачала чытаць. Аўтарка — Кася Глухоўская. У выніку знайшла яе, і мы зрабілі песні на яе вершы.

Я не магу дазволіць сабе дэкарацыі і іншыя рэчы, таму вельмі спадзявалася сустрэць тых, хто дапаможа ўвасобіць патаемныя задумы. Напрыклад, дзякуючы аднаму з сотавых аператараў, мы зможам зрабіць якасны відэазапіс гэтага вечара. Шмат людзей дапамагае. На адным праекце я пазнаёмілася з Настай Шастак — яна займаецца пескаграфіяй (*мастацтва малявання пяском.* — **Аўт.**). Убачыўшы яе работы, палічыла Насту недасяжнай, аднак яна пагадзілася на супрацоўніцтва. Цяпер уяўляем, як усё адбудзецца.

***— І як жа?***

— Гэты канцэрт я называю «спектаклем для сябе». Тыя, хто ходзіць на канцэрты, зразумеюць пра што я, бо нашы выступленні па фармаце нагадваюць міні-спектаклі. І не таму, што я так хачу, а проста так атрымліваецца. Мне ж падабаецца нешта з куфра даставаць і на сябе апранаць, плюс яшчэ і размаўляць люблю. Наш канцэрт будзе такой лірычнай гісторыяй, але не на ўзроўні «ты і я — каханне», а прасякнутай прадчуваннем «вясна ўжо прыйшла, але прырода яшчэ не прачнулася». Ёсць, напрыклад, адна кампазіцыя, якую мы жартаўліва называем «Песняры», яна выбіваецца з ліку астатніх. Мы яе выконваем — і пачынаем усміхацца, весяліцца і танцаваць. І Наста ў нас павінна спрацаваць не проста як мастак, які працуе на фоне музыкі. Мы хочам, каб была закальцаванасць дзеі, і мастачка рабіла свае ўстаўкі малюнкаў там, дзе будзе адчуваць у гэтым неабходнасць. Мне на гэтым спектаклі нават касцюм не патрэбен, бо ён — мая група, тое, што стварае Наста і, спадзяюся, зробіць гукавое афармленне.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Суладдзе

# ПАЖАНІЦЦА Ў 20,

## або Цяпер мы разам. І гэта — плюс

**На студэнтаў, якія бяруць шлюб, часта глядзяць са здзіўленнем. Падумаць толькі: абое маладыя, без пастаяннай працы... Тым не менш, знаходзяцца смелыя пары, якім хораша перш за ўсё таму, што ў іх ёсць каханне і жаданне заўжды быць разам. Гэта і дае сілы на тое, каб з цягам часу здабыць усё астатняе. Прынамсі, так лічаць студэнты Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Максім і Юлія Багдзель, якія паўгода таму сталі мужам і жонкай...**

...Нас запрашаюць у невялічкі інтэрнацкі пакой. Канапа, халадзільнік, тэлевізар, стол каля акна. Нягледзячы на малую прастору, тут утульна: фіранкі падабраны пад колер шпалер, стол заслany абрусам, на бачным месцы — вясельнае фота.

— Мая каханая назвала свой заручальны пярсцёнак «крыху замужам», каб так ніхто і не зразумеў, ці ёсць у яе на самой справе муж, — так Максім распавядае пра ўпрыгажэнне, якое яго жонка носіць на безыменным пальцы правай рукі. Адразу становіцца зразумела: з такім мужам дакладна не засумуеш.

Справа ў тым, што Юлін заручальны пярсцёнак — з металу «сярэбранага» колеру, аздоблены каменьчыкамі, а ў Максіма — залаты. Можна сказаць, фамільны. Яго купіла бабуля. Такі падарунак яна зрабіла кожнаму ўнуку. Пярсцёнкі, трэба сказаць, былі не з танных: якаснае «даўнейшае» золата, ды і вага дазваляла занесці да майстра і зрабіць яшчэ адзін для нявесты, «распалавініўшы» першапачатковы варыянт. Але Максім не настойваў на такім рашэнні (Юля не любіць упрыгажэнні з золата) і дазволіў дзяўчыне выбраць пярсцёнак на свой густ. Усё ж насіць трэба будзе доўга-доўга. Таму ён павінен быць самым прыгожым.

**Не пярэчыць жонцы — мудрае рашэнне. У 21 год (а менавіта па столькі цяпер Максіму і Юлі) такі падыход сустрэнеш рэдка. Ды і далёка не ва ўсіх у такім узросце ёсць свая сям'я.**

*(Заканчэнне на 6-й стар. «ЧЗ».)*




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Выпрабавана на сабе

# МУЗЕЙ — НЕ ТЭАТР, ТАМ УСЁ САПРАЎДНАЕ

## На дзень карэспандэнт «Чырвонкі» стала экскурсаводам

**Год таму ў мяне з'явілася працоўная кніжка і першы запіс у ёй: «навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа». Тэрмін працы — паўгода, якія праляцеў быццам тыдзень. Праз год я вярнулася ў музей на адзін дзень, каб расказаць чытачам пра «хлеб» музейных работнікаў.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### ПАТРАБУЮЦЦА, ПАТРАБУЮЦЦА...

Напэўна, многім праца ў музеі падаецца рамантычным заняткам — адразу на думку прыходзяць філалагічнага выгляду дзяўчаты ў акулярах ці акуратныя сівавалосыя бабулі з лагоднай інтанацыяй у голасе. Але гэта «ружовыя акуляры». Многія работнікі са стажам скажуць, што праца музейшчыка не надта ўдзячная: плацяць мала, а высілкі вялікія. Для даведкі: музей Коласа — самы «танны» ў Мінску. Экскурсія год таму каштавала 7 тысяч рублёў, цяпер — 10.

**Цякучка ў музеі — справа звычайная, бо грошай «на ніве культуры» асабліва не заробіш, таму тут многія часта знаходзяць часовую працу: маладыя спецыялісты «адбываюць» размеркаванне, экскурсаводы напрацоўваюць стаж.**

Крыху перадгісторыі. У музей я трапіла выпадкова: у жніўні шукала сабе працу на семестр і было жаданне паспрабаваць сябе на іншай «ніве». Абвестка ў сацыяльнай сетцы запрашала чалавека на пасаду навуковага супрацоўніка ў музей Якуба Коласа. Да гэтага дня я з-за свайго невуцтва нават і не чула пра такі... Пасля нядоўгіх ваганняў трапіла на гутарку да дырэктара музея Зінаіды Камароўскай. Мяне хвалявала, ці прымуць на працу чалавека з журналісцкай адукацыяй. Аказалася, тут чакаюць і філолагаў, і гісторыкаў, і журналістаў. Асноўныя патрабаванні: валоданне беларускай мовай, актыўнасць, добразычлівасць і ўпэўненасць. Цякучка ў музеі — справа звычайная, бо грошай «на ніве культуры» асабліва не заробіш, таму тут многія часта знаходзяць часовую працу: маладыя спецыялісты «адбываюць» размеркаванне, экскурсаводы напрацоўваюць стаж. Людзі патрэбны заўжды, вось і падчас майго вяртання на адзін дзень у музеі не хапала ажно трох супрацоўнікаў.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
10 04 2014 г.

*Працоўныя перспектывы*

# ПАТРАБУЮЦЦА ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ І АДКАЗНЫЯ

## Якое працаўладкаванне выгаднае і студэнтам, і наймальнікам?

**«Ты — студэнт вышэйшай навучальнай установы і думаеш пра сваю кар'еру? Мы адкрытыя для дыялогу». «Група кампаній прадастаўляе студэнтам унікальную магчымасць працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці і па гнуткім графіку. Самыя паспяховыя і мэтанакіраваныя са стажораў змогуць пасля атрымання дыплома прафесійна расці і развівацца ў кампаніі». «Мы прадастаўляем магчымасць студэнтам, якія імкнуцца прымяніць свае веды і навыкі для рашэння практычных задач, атрымаць каштоўны вопыт падчас праходжання кароткатэрміновай праграмы стажыроўкі»... Такімі аб'явамі і прапановамі сустракаў студэнтаў факультэт міжнародных адносін БДУ, на базе якога днямі прайшоў агульнаўніверсітэцкі «Дзень кар'еры — вясна 2014».**

### ФОРМУЛА ПОСПЕХУ — ВУЧОБА ПЛЮС ПРАКТЫЧНЫ ВОПЫТ

Раней сустрэчы патэнцыяльных наймальнікаў і студэнтаў праводзіліся ў БДУ на асобных факультэтах, а агульнае для ўсіх студэнтаў мерапрыемства прайшло ўпершыню.

— Мы вырашылі змяніць фармат факультэцкіх кірмашоў вакансій, куды запрашаліся, як правіла, профільныя прадпрыемствы і арганізацыі. Вельмі часта прадпрыемствам і кампаніям патрабуюцца аднachасова спецыялісты самых розных профіляў, а БДУ — менавіта шматпрофільны ўніверсітэт: мы рыхтуем спецыялістаў і для ІТ-сферы, і для банкаўскай сферы, эканамістаў, знаўцаў міжнароднага права, філолагаў і гэтак далей. Таму «Дзень кар'еры» — больш маштабнае мерапрыемства, — патлумачыў **прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце Аляксей ДАНІЛЬЧАНКА.** — Тут удзельнічаюць каля 20 замежных і айчынных прадпрыемстваў, якія прадстаўляюць розныя сферы дзейнасці. Упэўнены, што гэта мерапрыемства будзе карыстацца вельмі папулярнасцю і сярод студэнтаў, і сярод працадаўцаў. Мы плануем праводзіць яго двойчы на год — восенню і вясной.

У нейкім сэнсе штуршком да новай формы работы стала наведванне супрацоўнікамі БДУ Маскоўскага дзяржаўнага інстытута (універсітэта) міжнародных адносін. У гэтай вельмі прэстыжнай расійскай ВНУ быў створаны Цэнтр кар'еры, бо, у адрозненне ад Беларусі, у Расіі няма сістэмы размеркавання выпускнікоў і, адпаведна, праблема пошуку першага працоўнага месца з'яўляецца клопатам саміх учарашніх студэнтаў. Для ўсіх працадаўцаў адной з галоўных умоў з'яўляецца наяўнасць у прэтэндэнта практычнага вопыту работы. Нават дыплом прэстыжнай ВНУ не адкрывае жаданыя дзверы. Падлічана, што выпускнікі праводзяць у пошуках першага працоўнага месца ў сярэднім тры гады. І хоць у БДУ размяркоўваюцца 99% выпускнікоў бюджэтнай формы навучання, а попыт на многіх спецыялістаў нават перавышае прапанову, тым не менш прыцягненне новых патэнцыяльных заказчыкаў кадраў вельмі цікавіць кіраўніцтва БДУ. У тым ліку і ў плане арганізацыі для студэнтаў вытворчай практыкі.

### ІТ-ПРАФЕСІІ ДЛЯ ФІЛОЛАГАЎ І ЮРЫСТАЎ

Што адразу кідалася ў вочы, дык гэта вельмі актыўны ўдзел у «Дні кар'еры» ІТ-кампаній. Яно і зразумела: ІТ-сфера імкліва развіваецца і кампаніям патрабуецца ўсё больш спецыялістаў.

— Хоць у мяне асабіста гэта першы вопыт зносін са студэнтамі, але наша кампанія дастаткова даўно ўдзельнічае ў аналагічных мерапрыемствах, — расказала журналісту «Чырвонкі» **спецыяліст па падборы кадраў кампаніі Qulix Systems Таццяна ДАВЫДАВА.** — Мы спрабуем знайсці не толькі распрацоўшчыкаў праграмнага прадукту, але і тэсціроўшчыкаў, і бізнес-аналітыкаў. Я асабіста пераканалася ў тым, што студэнты не разумеюць, як яны могуць сябе прымяніць у нашай сферы. Напрыклад, падыходзяць будучыя юрысты, і я тлумачу ім, як яны могуць рэалізаваць сябе ў бізнес-аналізе ці ў тэсціраванні праграмнага прадукту, што работа тэсціроўшчыка не патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі і навучання ў БДУІР — для яе патрэбны аналітычныя здольнасці. Мяркую, што ў любым выпадку гэтая інфармацыя будзе для студэнтаў карыснай, нават калі яны не цяпер, а пазней вырашаць прыйсці ў ІТ-сферу, дзе, між іншым, можна зарабляць вельмі дастойныя грошы.

Карпарацыя «Галактыка» ўжо не першы год рэалізуе адукацыйную праграму «Галактыка і ВНУ», у рамках якой студэнты атрымліваюць бясплатную кансультатыўную і тэхнічную дапамогу ў навучанні інфармацыйным тэхналогіям кіравання. Для студэнтаў выпускных курсаў прапануецца стажыроўка, праходжанне тэхналагічнай,




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

вытворчай і перадыпломнай практыкі. Па словах **менеджара па персанале Пятра КНЫША**, у гэтым годзе на практыку да іх прыйшло 75 студэнтаў з розных ВНУ. І 15 з іх атрымалі запрашэнне на работу. Гэтую лічбу ў кампаніі лічаць вялікай, што сведчыць пра дастаткова высокія патрабаванні да прэтэндэнтаў на працаўладкаванне.

**Добрыя спецыялісты будуць запатрабаваны ва ўсе часы, а працадаўца заўсёды будзе шукаць сярод студэнтаў самых таленавітых, мэтанакіраваных і паспяховых.**

### ХОЧАШ ПРАЦАВАЦЬ? ПАКАЖЫ ЗАЛІКОЎКУ...

Не меншым попытам карысталіся на «Дні кар'еры» і студэнты, адукацыя якіх дазволіць ім працаваць у эканамічнай ці банкаўскай сферы. Так што меркаванне наконт перавытворчасці ў нашай краіне юрыстаў і эканамістаў асабіста ў маім уяўленні вельмі пахіснулася.

— Мы спрабуем знайсці сярод вялікай колькасці спецыялістаў з эканамічнай адукацыяй у першую чаргу тых, хто падыходзіць нам, і тых, каму будзе цікава працаваць з намі, таму што, калі чалавеку нецікава працаваць, гэта страчаны кадр, — падзяліўся сакрэтамі сваіх пошукаў **супрацоўнік кампаніі ERNST&YOUNG Святаслаў СВЯЦКІ.** — Нас цікавяць і выпускнікі, і студэнты — апошнім мы дапамагаем вызначыцца з выбарам. Магчыма, што сённяшняму студэнту будзе цікавая сфера аўдыту і кансалтынгу, у якой мы працуем, а ён ніколі не ўяўляў сабе, што гэта такое. А раптам аўдыт можа аказацца сэнсам яго кар'еры? Мы робім заяўкі на размеркаванне ў нашу кампанію тых студэнтаў, якія паспяхова прайшлі стажыроўку і добра сабе зарэкамендавалі. Дарэчы, сярэдні ўзрост супрацоўнікаў кампаніі застаецца невысокім.

На століку, дзе размясціліся «рэкрутёры» з BelSwissBank, значылася, што **банку патрабуюцца касіры, эканамісты, бухгалтары, юрысты, сакратары.**

— У нашым банку надаюць самую пільную ўвагу ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў у сферы эканомікі. Сапраўды, у нас ёсць шэраг вакансій, паколькі адкрываюцца новыя разліkова-касавыя цэнтры. І мы гатовы прыцягваць на работу перспектыўную моладзь, — расказала **начальнік аддзела па рабоце з персаналам BelSwissBank, кіраўнік карпаратыўнага вучэбнага цэнтра Алена КАСЯК.** — Прычым нас цікавяць студэнты не толькі эканамічных спецыяльнасцяў, але і юрыдычных, факультэта міжнародных адносін. Хачу запэўніць у тым, што добрыя спецыялісты будуць запатрабаваны ва ўсе часы, а працадаўца заўсёды будзе шукаць сярод студэнтаў самых таленавітых, мэтанакіраваных і паспяховых. Адзін з крытэрыяў паступлення да нас на работу студэнтаў — гэта высокі сярэдні бал (не ніжэй за 8 балаў) і веданне хоць бы адной замежнай мовы. Хачу падкрэсліць, што мы садзейнічаем моладзі ў атрыманні вышэйшай адукацыі. У нас практыкуецца частковая кампенсацыя сродкаў за навучанне, прадастаўляецца водпуск на сесію. А з касіраў нашы работнікі вырастаюць да эканамістаў. Хочаш рухацца наперад — калі ласка, мы даём такую магчымасць. Жаданне расці заўсёды будзе заахвочвацца.

Увогуле, студэнты БДУ атрымалі ў «Дзень кар'еры» шмат карыснай інфармацыі не толькі аб вакансіях, магчымасці праходжання практыкі або стажыроўкі, але і пра спецыфіку той ці іншай сферы дзейнасці і сучасныя патрабаванні да маладых спецыялістаў. Такое працаўладкаванне павінна быць выгадна ўсім: не толькі маладому чалавеку, але і наймальніку. Апошні гарантуе свайму работніку дастойную заработную плату, сур'ёзны сацыяльны пакет і магчымасць 100-працэнтнай самарэалізацыі, але і ўзамен патрабуе нямала. На першым месцы веды і інтэлект, жаданне развівацца, ініцыятыўнасць, уменне планаваць сваю дзейнасць і расстаўляць прыярытэты, адказнасць, якасць ва ўсім, гатоўнасць вырашаць складаныя задачы. Вітаюцца лідарства, упэўненасць у сваіх сілах, матывацыя і энтузіязм, аналітычныя здольнасці, стрэсаўстойлівасць. Як трапна сказаў дырэктар па персанале групы кампаній «Алютэх» Аляксандр Мудрык, «нам патрэбныя людзі з агнём у вачах і прапелерам у вядомым месцы; «пахаць» давядзецца шмат, але гэтая работа будзе добра аплачвацца; мы вітаем жаданне маладых людзей, якія хочуць зрабіць кар'еру, але з цвярозым бачаннем свету».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ХІМІЯ + МАТЭМАТЫКА: «РЭАКЦЫЯ» ПАЙШЛА...

**У Ліцэі БДУ стартавала прыёмная кампанія. Падаць дакументы можна да 6 мая ўключна. Набор старшакласнікаў у ліцэй будзе весціся на пяць напрамкаў навучання: фізіка-матэматычны, хіміка-біялагічны, філалагічны, грамадазнаўчы і хіміка-матэматычны.**

Пакуль што Ліцэй БДУ — адзіная навучальная ўстанова ў краіне, дзе будзе весціся набор старшакласнікаў па хіміка-матэматычным профілі. Школьнікам, якія пажадаюць вучыцца на новым напрамку, трэба будзе здаць іспыты па хіміі і матэматыцы.

Неабходнасць у адкрыцці новага напрамку была абумоўлена новымі патрэбамі рынку працы і інавацыйнай эканомікі. Ствараць найноўшыя экалагічна чыстыя матэрыялы, развіваць фармацэўтычныя тэхналогіі, нанатэхналогіі і г.д. без высокакваліфікаваных кадраў, якія добра разбіраюцца аднachасова і ў хіміі, і ў матэматыцы, праблематычна. Акрамя таго, абітурыенты, якія паступаюць на хіміка-тэхналагічныя і хімічныя спецыяльнасці ў ВНУ, здаюць уступныя іспыты менавіта па хіміі і матэматыцы...

Адным з нававядзенняў прыёмнай кампаніі стане дазвол абітурыентам выбіраць іспыты пры паступленні на грамадазнаўчы напрамак. Яны будуць здаваць гісторыю Беларусі і сусветную гісторыю або грамадазнаўства. Такі ж дазвол уже другі год дзейнічае і на філалагічным профілі: там абітурыенты выбіраюць дзве дысцыпліны з трох прапанаваных. На выбар прапануюцца беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура і англійская мова.

Уступныя экзамены пройдуць у Ліцэі БДУ 11, 18 і 24 мая. А з 28 красавіка па 5 мая на серверы дыстанцыйнага навучання ліцэя для ўсіх ахвотных будуць бясплатна праведзены рэпетыцыйныя выпрабаванні.

У Ліцэі БДУ нагадалі, што без уступных іспытаў у ліцэісты залічваюцца пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды (дыпломы І, ІІ і ІІІ ступені) па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі, гісторыі, грамадазнаўстве, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры і англійскай мове.

На час навучання ў ліцэі ўсе іншагароднія забяспечваюцца месцам у інтэрнаце.

## РАЗУМНІКІ З БДУ

**Студэнцкая каманда БДУ «Паўсюль яны» стала абсалютным пераможцам ІХ адкрытага чэмпіянату ВНУ Расіі па інтэлектуальных гульнях. У зборную прызёраў увайшлі студэнты геаграфічнага факультэта другакурснік Іван Зайкоў і пяцікурснік Станіслаў Алімпаў, студэнтка трэцяга курса Інстытута журналістыкі Вікторыя Волкава, чацвёртакурсніца факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій Алена Гардынец, пяцікурснік механіка-матэматычнага факультэта Віталь Калачоў і трэцякурснік гістарычнага факультэта Аляксандр Марозаў.**

Чэмпіянат праводзіўся па чатырох дысцыплінах: «Што? Дзе? Калі?», «Хет-трык», «Свая гульня» і «Мазгавы штурм». Сума набраных балаў па ўсіх дысцыплінах і дазволіла камандзе БДУ стаць абсалютным чэмпіёнам. У фінальным паядынку чэмпіянату ўдзельнічалі больш як 45 каманд з Расіі і тры з Беларусі. А праз адборачныя туры прайшлі больш як 1,5 тысячы каманд са 123 ВНУ Расіі, Украіны, Латвіі, Беларусі і Малдовы.

Арганізатарамі інтэлектуальнай гульні выступілі Санкт-Пецярбургскі філіял Міжнароднай асацыяцыі клубаў «Што? Дзе? Калі?», які ўзначальвае віцэ-прэзідэнт МАК Аляксандр Друзь, прафкам студэнтаў Ніжагародскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта імя М. Лабачэўскага, клуб інтэлектуальных гульняў Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта аэракасмічнага прыборабудавання «Аэрабрэйн» і Ніжагародскі інтэлектуальны клуб.

## СТУДЭНТЫ І ХАКЕЙ

**Акцыя «Студэнцтва сустракае чэмпіянат», прымеркаваная да чэмпіянату свету па хакеі, стартавала ў вышэйшых навучальных установах.**

Унікальнае па сваіх маштабах спартыўнае мерапрыемства прыцягне ўвагу не толькі айчынных аматараў хакея, але і мноства замежных хакейных балельшчыкаў, якія наведаюць Мінск. Студэнцкая моладзь будзе задзейнічана ў суправаджэнні дэлегацый, рабоце ў гасцініцах і непасрэдна ў месцах правядзення спартыўных мерапрыемстваў.

У рамках акцыі «Студэнцтва сустракае чэмпіянат» прадугледжана стварэнне відэаролікаў аб спартыўным жыцці ВНУ для іх дэманстрацыі падчас чэмпіянату ў фанзонах інтэрнатаў у Студэнцкай вёсцы. Нагадаем, што Студэнцкая вёска будзе задзейнічана для размяшчэння гасцей чэмпіянату. Таксама запланаваны цыкл сустрэч студэнтаў з ветэранамі беларускага хакея, прадстаўнікамі хакейных клубаў, студэнтамі-хакеістамі, бліц-апытанні і флэшмобы «ЗараДка з зоркай», мерапрыемствы на спартыўную тэматыку з запрашэннем беларускіх спартсменаў, міжуніверсітэцкія інтэлектуальныя гульні на хакейную тэматыку. А студэнтаў, якія захапляюцца фатаграфаваннем, запрашаюць паўдзельнічаць у першым этапе рэспубліканскага конкурсу на лепшую фотаработу «Моладзь выбірае спорт!». Пераможцам абяцаюць бясплатныя білеты на хакейныя матчы чэмпіянату свету з удзелам беларускай каманды.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ПерадуМОВА

# НАВОШТА ПРАГРАМІСТУ «Ў»,
## або Як навучыць камп'ютар «размаўляць» па-беларуску?

**Тое, што камп'ютары сталі не проста важнай, а сапраўды неад'емнай часткай нашага жыцця, нават не абмяркоўваецца. Праца, вучоба, баўленне часу — усё гэта сёння адбываецца пры дапамозе камп'ютарнай тэхнікі. А вось сустрэць у гэтым электронным свеце беларускую мову складана. Буйныя кампаніі, што займаюцца выпускам праграмнага забеспячэння, часцей за ўсё не звяртаюць увагі на тое, што ў Беларусі дзве дзяржаўныя мовы. Сярод людзей, якія не захацелі мірыцца з такой сітуацыяй, — Алесь БУЛОЙЧЫК, праграміст і перакладчык на беларускую мову. Мы сустрэліся з ім, каб даведацца, ці магчыма зрабіць віртуальны свет больш беларускім.**

Фота Надзеі БУЖАН.



***— Алесь, напачатку раскажыце, што гэта для вас увогуле — праца па перакладзе праграм?***

— Насамрэч, я не назваў бы сябе менавіта перакладчыкам. Па прафесіі я праграміст, працую ў адной з буйных IT-кампаній. У перакладчыцкіх праектах пакідаю за сабой тое, што ўмею рабіць лепш, — тэхнічную працу. А вось уласна перакладам звычайна займаюцца мае паплечнікі, якім гэта больш даспадобы. Не буду пералічваць іх усіх: баюся не ўзгадаць і пакрыўдзіць кагосьці, бо гэта сапраўды калектыўная, а не індывідуальная праца.

Пераклад праграм на мову — гэта хобі, тое, што я раблю ў вольны ад працы час. Навошта? У першую чаргу таму, што гэтага няма. Ну і нельга забівацца на такую рэч, як шчасце творцы. Я лічу, што ў кожнага чалавека павінен быць нейкі занятак для душы. Я ўпэўнены, што прыйдзе той момант, што беларуская мова ў электронным свеце пачувае сябе трохі лепш, чым у рэальным жыцці. Гэта датычыцца ў першую чаргу інтэрнэту. І таму трэба ствараць умовы для таго, каб беларускамоўны чалавек адчуваў сябе ў віртуальнай рэальнасці максімальна камфортна.

***— Праграміст і мова — цікавае спалучэнне. Звычайна мова асацыюецца з прадстаўнікамі гуманітарных спецыяльнасцяў...***

— Не думаю, што такое сцвярджэнне справядлівае. Менавіта ў праграмісцкай супольнасці шмат людзей, якія цікавяцца айчыннай культурай і, у прыватнасці, мовай. Беларускамоўны праграміст — зусім не рэдкасць.

Мая сям'я рускамоўная, і ў школе беларускай мовай я асабліва не цікавіўся. Юнацтва прыйшлося якраз на адраджэнскую хвалю канца 1980-х — пачатку 1990-х. Тады я пачаў чытаць беларускамоўную прэсу, літаратуру, пачаў цікавіцца грамадскім жыццём. Усё гэта зрабіла свой унёсак. З развіццём інтэрнэту магчымасці вывучаць мову пашырыліся: беларускамоўнае асяроддзе на форумах і ў сацыяльных сетках, дзясяткі перакладзеных фільмаў, вялікая колькасць кніг і артыкулаў у сецібе.

***— Алесь, чаму сусветныя карпарацыі, якія займаюцца распрацоўкай праграмнага забеспячэння, звычайна не надаюць увагі беларускай мове?***

— Усё вельмі проста. Лакалізацыя праграм звычайна адбываецца трыма шляхамі. Першы — самы просты, назавём яго патрабавальным — калі пакупнік «софта» патрабуе ад пастаўшчыка перакладаць праграмы на абедзве дзяржаўныя мовы. На жаль, у нас пакупнікі такіх патрабаванняў не прад'яўляюць. Зразумела, што, калі распрацоўшчык мае магчымасць не выконваць лішнюю працу, ён рабіць яе не будзе.

Хоць, шчыра кажучы, бываюць і выключэнні. Гэта якраз і ёсць другі шлях — калі сама кампанія хоча падтрымаць свой статус і паказаць, што яна паважае культуру краіны, цікавіцца ёй. Існуе і варыянт, калі кампанія дае магчымасць рабіць пераклад сваіх праграм нейкай суполцы зацікаўленых людзей. Яскравы прыклад — карпарацыя Google, найбуйнейшы ў свеце інтэрнэт-пошукавік. Вялікая колькасць сэрвісаў гэтай кампаніі перакладзена на беларускую мову, і кожны можа імі карыстацца. Сервіс Google Translate дазваляе зрабіць анлайн-пераклад любога тэксту на беларускую мову з іншых, і наадварот. У самай папулярнай у свеце аперацыйнай сістэме для смартфонаў пад назвай Android, якую распрацоўвае ўсё той жа Google, можна ўводзіць тэкст па-беларуску. І, скажу па сакрэце, нават інтэрфейс некаторых прылад гэтай аперацыйнай сістэмы ўжо перакладзены на мову. Вось толькі працаваць з ім пакуль што немагчыма: беларуская лакалізацыя адсутнічае ў спісе сістэмных. Але будзем спадзявацца, што хутка ўсё зменіцца да лепшага.

Трэці шлях — так званы «оўпэн сорс» (ад англ. open source — літаральна «адкрытая крыніца»), тое, чым у прыватнасці, мы і займаемся. Пераклад намаганнямі саміх карыстальнікаў. І тут аніякіх абмежаванняў няма. Бяры і рабі.

***— А ці трэба быць прафесіяналам у свеце праграмавання, каб займацца перакладам праграм?***

— Зусім неабавязкова, калі ты працуеш не адзін. Зразумела, у такой працы ёсць тэхнічныя моманты, але іх прыкладна 20 працэнтаў ад усяго аб'ёму працы. Усё астатняе — натуральна пераклад, а гэта ўжо можа рабіць і чалавек, які з камп'ютарам знаёмы на бытавым узроўні. Праблема ў іншым: вельмі цяжка знайсці людзей, якія хацелі б выдаткоўваць свой час і займацца гэтым. Пераклад патрабуе вельмі карпатлівай і, звычайна, штодзённай працы.

***— Якімі праектамі вы ганарыцеся або лічыце іх самымі важнымі?***

— Мы зрабілі беларускую лакалізацыю аперацыйнай сістэмы для персанальных камп'ютараў Windows 7, пераклад аперацыйнай сістэмы для смартфонаў Android. Стварылі беларускамоўную раскладку для віртуальнай клавіятуры AnySoft Keyboard. Зараз працуем над перакладам карт і навігацыі для Android-смартфонаў OsmAnd Maps & Navigation. Менавіта ў апошнім праекце мне падаецца вельмі ўдалым агучванне навігатара, які падказвае карыстальніку (звычайна, кіроўцу) дарогу. Гук мы запісвалі на прафесійнай студыі, і атрымалася вельмі ядрэнна. Нават рускамоўныя карыстальнікі адзначылі, што інфарматыўнасць нашага навігатара атрымалася лепшай за іх.




***— Ці адсочваеце вы далейшы шлях вашых праектаў? Увогуле, наколькі запатрабаваны беларускамоўны «софт» сярод саміх карыстальнікаў?***

— Дакладна магу сказаць, што спажывец для іх знаходзіцца. Але папулярнасць вельмі залежыць ад таго, наколькі проста пераклад усталёўваецца. Напрыклад, беларуская лакалізацыя Android патрабуе правоў так званага root-карыстальніка (спецыяльныя правы па кіраванні смартфонам, якія звычайна не прадастаўляюцца вытворцамі апаратаў, а атрымліваюцца ўладальнікамі тэлефонаў самастойна). Ну і, безумоўна, ад таго, ці чулі людзі ўвогуле пра існаванне такіх перакладаў. Калі называць лічбы, то беларускую раскладку для AnySoft Keyboard усталявалі некалькі тысяч карыстальнікаў, больш за тысячу чалавек загрузілі пераклад для Android. Спадзяюся, што гэта не максімальна магчымыя лічбы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*Дапамагчы з перакладам праграмнага забеспячэння і карт на беларускую мову можна, звязаўшыся з Алесем Булойчыкам праз электронную пошту: alex73mail@gmail.com.*

# МУЗЕЙ — НЕ ТЭАТР, ТАМ УСЁ САПРАЎДНАЕ

### ЦЯЖКАСЦІ ПЕРАКЛАДУ

...Мае наведвальнікі — шасцікласнікі. Скажу адразу: аўдыторыя непаслухмяная. Затое цікаўная. У іх ёсць цяга здымаць на мабільныя тэлефоны ўсё, што захапіла ўвагу. Стрэльба, фотаапарат, залаты гадзіннік, савецкі тэлевізар «Тэмп-2», які, хутчэй за ўсё, падаецца ім звычайнай драўлянай скрыняй. Змагацца з «фотапалваннем» у мяне ахвоты ніколі не было, хоць звычайна групы дадаткова не аплачвалі гэтую паслугу. Таму малым заўжды перашкаджалі захавальнікі музея. Праводжу дзяцей на другі паверх музея, у мемарыяльную частку: «Цяпер мы падымаемся на другі паверх па лесвіцы....» — і тут мяне першы раз перабіваюць: «...па якой падымаўся Якуб Колас». Цудоўна, думаю, дзеці запомнілі, у які музей прыйшлі.

Увогуле, яшчэ на пачатку працы заўважыла, як карысна ўжо з першых хвілін правільна «падаць» матэрыял экскурсантам. З малымі лепш за ўсё размаўляць простай мовай, задаваць пытанні, а напрыканцы экскурсіі зрабіць кантрольную апытанку. У такім выпадку будзе ўпэўненасць у тым, што твая праца прайшла не дарма. Старшакласнікі і студэнты ўважліва слухаюць гісторыю кахання Якуба Коласа і яго жонкі Марыі Дзмітрыеўны, вайсковцы не прамінуць аповед пра турэмнае зняволенне пісьменніка. Галоўнае, быць шчырым і не рабіць з сябе акцёра: музей — не тэатр, тут усе экспанаты — сапраўдныя.

...Чуецца знаёмае: «Ого, Якуб Колас шыкоўна жыў!» І тут мая задача заключаецца ў тым, каб разбурыць першаснае памылковае ўяўленне і расказаць пра сціпласць народнага пісьменніка. Але яны не надта вераць, бачачы вялізную жырандолю, пазалочаны гадзіннік, раяль, дарагую мэблю. Мне заўжды падабалася праверць эрудыцыю малых. У каторы раз задаю пытанне: «Які антычны бог адлюстраваны на залатым гадзінніку, што знаходзіцца перад вамі? Даю падказку — ён быў адказным за мастацтва і навуку?» І тут пачалося... Геркулес, Праметэй, «а падкажыце, на якую літару пачынаецца яго імя». У выніку, калі правільнага адказу не чую — кажу: «Дзеці, гэта Апалон». І яны, быццам узгадаўшы старую інфармацыю, ківаюць: «А, ну так, Апалон, мы ведаем».

Заканчваю экскурсію словамі: «Заходзьце, калі ласка, у наш музей яшчэ — у нас часта адбываюцца розныя мерапрыемствы». На што дзеці пытаюцца: «Ужо скончылася? Мы можам ісці? Можна, мы яшчэ паходзім і зробім здымкі?» Я дазваляю, «забыўшыся», што фатаграфаванне забаронена. Экскурсія скончылася, можна ісці адпачываць.

### «КУХНЯ» КОЛАСАЗНАЎЦАЎ

Праз год, каб аднавіць у галаве факты, мне хапіла некалькі разоў перачытаць 30 старонак тэксту. А навічку трэба асвоіць усю экспазіцыю музея за два тыдні і здаць кантрольную экскурсію. Тэрмін невялікі, асабліва калі вы жадаеце паглыбіцца ў справу. За гэты час можна агледзець музей уздоўж і ўпоперак, задаваць пытанні сталым супрацоўнікам, капацца ў фондах і архівах, перачытваць творы. Увогуле, падчас маёй працы людзі тут былі няпростыя: Марыя Нічыпараўна — жонка пісьменніка Генрыха Далідовіча, Наталля Аляксандраўна — дачка Алеся Адамовіча, Васіліна Міхайлаўна Міцкевіч — праўнучка дзядзькі Якуба. Усе выдатна ведаюць экспазіцыю, бо працуюць ужо даўно.

Праца пачыналася а палове дзясятай раніцы, заканчвалася а шостай вечара. У мяне была палова стаўкі, каб мець магчымасць сумяшчаць працу і вучобу, таму я працавала ўсяго чатыры гадзіны, а пасля імчалася ва ўніверсітэт. Занятасць у музеі не скажу каб вялікая была: бывала, за дзень адну экскурсію правядзеш ці дзве. Увесь астатні час адводзіўся на самаадукацыю: мы чыталі «Новую зямлю», «Сымона-музыку», «Дрыгву», «У палескай глушы» — асноўныя творы, на якіх робіцца акцэнт у экспазіцыі. Рабілі адмысловыя лісткі з цытатамі, вершамі, якія пасля завучвалі, каб распавядаць на экскурсіях. Але толькі імі і чытаннем кніг праца не абмяжоўвалася: даволі часта ўзнікала патрэба напісаць прэс-рэліз, дасласць запрашэнні на мерапрыемствы, прыдумаць канцэпцыю будучага свята. Таксама я рабіла гадавы каляндар па юбілейных датах, якія перарасталі ў мерапрыемствы ці тэматычныя выставы.

На дзяжурствах па суботах у музеі заўжды заставаўся адзін экскурсавод, які праводзіў па чатыры экскурсіі запар. Кожны чацвер у музеі — адказны, бо праходзяць розныя мерапрыемствы: выставы, прэзентацыі. Дом падбудовы пачатку 1950-х гадоў не разлічаны на вялікую колькасць людзей. Напрыклад, для другога паверха ёсць ліміт — не больш за 30 наведвальнікаў.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### «БАТЛЕЙКА» І НАШ ТРЫУМФ

«Акрамя непасрэдна экскурсій трэба ўдзельнічаць яшчэ і ў лялечным тэатры», — сказалі мне пры працаўладкаванні. Чамусьці ў было ўяўленне — будзем ставіць батлейку! Але гэтага не здарылася: у нас быў тэатр з лялькамі-пятрушкамі ды шырма «ў кветачкі». Праз год шырма сустрэла мяне на тым самым месцы, у другой зале, — але цяпер яна была яскравай і шыкоўнай. Лялькі таксама змяніліся... Здача лялечнага выступлення была другім «кандыдацкім мінімумам», і спрабаваць сябе ў артыстычным амплуа мы стараліся ў пары з Яўгеніяй Мятлушкай. Дзяўчына прыйшла ў музей па размеркаванні, на тыдзень пазней за мяне. Практыкаваліся мы без спецыяльнай падрыхтоўкі: глядзелі, як гэта робяць іншыя, а далей ужо самі паказвалі свае здольнасці. Мы садзілі дзяцей на падушкі, самі хаваліся за шырмай, надзявалі на рукі лялькі і пачыналі падвываць на розныя галасы. Ставілі апрацаваную Коласам народную казку «Воўк-дурань».

Цяжка было хіба што голас своечасова пераменяць, але мы адточвалі і гэты навык. Праўда, у нас, асабліва ў Жэні, якая паказвала вядучага героя — ваўка, пасля лялек балелі рукі. Чытач можа задаць пытанне: хіба абавязкова экскурсавод ставіць лялечныя спектаклі? Вядома, гэтаму вучаць артыстаў, а не гісторыкаў і філолагаў. Справа ў тым, што музей наведваюць першакласнікі з другакласнікамі, для якіх нават спрошчаная экскурсія па Доме Коласа — даволі цяжкае выпрабаванне. А невялічкае «шоу» цалкам падыходзіць пад іх узрост. Стоячы за шырмай, мы неадночы станавіліся сведкамі ўласнага артыстычнага трыумфу, бо дзеці нам верылі і сыходзілі з музея з адчуваннем свята.

**Кацярына РАДЗЮК.**

### ЭПІЛОГ

*Я зусім не шкадую пра час, праведзены ў музеі, хоць праца ў ім фінансава мяне і не ўзбагаціла.*

*Я заўважыла, што нашым музеям часта не хапае якаснага піяру — нестандартнай прома-прадукцыі, выбуховых імпрэз. Прыемна, што за апошні год музей Якуба Коласа вельмі «прасунуўся» ў гэтым кірунку. Застаецца пажадаць Дому Коласа поспеху і росквіту.*

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар «ЧЗ».)**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
10 04 2014 г.

## УВАГА, АЎТАРЫ!

**Нагадваем юным і маладым удзельнікам конкурсу «Мы — такія!..», што, згодна з яго ўмовамі, творчыя работы рэдакцыя «Чырвонкі. Чырвонай змены» прымае да 1 мая (дата адпраўкі матэрыялаў). Гэта ў роўнай ступені адносіцца да «проб пяра», дасланых як звычайнай поштай, так і электроннай. Нагадаем, што з умовамі можна азнаёміцца ў нумары газеты ад 31 кастрычніка мінулага года або ў яе інтэрнэт-версіі. Лепшыя творчыя работы, атрыманыя пасля 1 мая (калі такія будуць), могуць быць апублікаваны пасля падвядзення вынікаў — ужо па-за конкурсам.**

Нагадаем, сёлета творчы конкурс «Мы — такія!..» праходзіць пры інфармацыйнай падтрымцы Міністэрства адукацыі. Дарэчы, рэдакцыя ўжо атрымала больш за 70 «проб пяра» ад школьнікаў з розных куткоў краіны. Сёння на старонках газеты, з улікам гэтага нумара, апублікаваны 32 лепшыя творчыя работы. Некаторыя ўдзельнікі конкурсу даслалі некалькі «проб пяра». Гэта не забаранялася, аднак, улічваючы масавасць удзельнікаў, рэдакцыя «Чырвонкі. Чырвонай змены» вырашыла даць шанц патрапіць на старонкі газеты (магчыма, са сваім першым у жыцці творчым сачыненнем), адчуць «смак» журналісцкага «хлеба» як мага большай колькасці юных і маладых няштатных аўтараў. Таму другія па ліку матэрыялы некаторых удзельнікаў конкурсу (якія адпавядаюць яго ўмовам) таксама будуць апублікаваны. Але пасля падвядзення яго вынікаў — як звычайныя журналісцкія матэрыялы. Пагадзіцеся, гэта будзе цалкам справядліва — ураўноўваць шанцы ўдзельнікаў на перамогу. Пакуль жа мы працягваем змяшчаць на старонках газеты тыя работы, якія паступілі да нас раней і якія адпавядаюць умовам конкурсу.

Калі будуць абвешчаны пераможцы? Мы будзем імкнуцца зрабіць гэта ў такі час, каб яны паспелі атрымаць (каму неабходна) рэкамендацыі ад рэдакцыі для паступлення на факультэт журналістыкі. Пра дакладную дату паведамім дадаткова.

# НАША «ХУТКАЯ ДАПАМОГА»

**Урач... Такая добрая і адначасова складаная прафесія, якая не церпіць памылак і заўсёды патрабуе быць пільнымі. Праўда, у народзе кажуць: «Лепш з урачамі не сутыкацца». Але я ўдзячная лёсу за тое, што мне пашанцавала сустрэць жанчыну, гледзячы на якую разумееш, што быць урачом — гэта прызванне.**



Нарадзілася Галіна Мікалаеўна Цэдрык (дзявочае прозвішча Мурашкевіч) у вёсцы Капінка Сенненскага раёна. У дзяцінстве гэта прыгожая каравокая дзяўчынка і не марыла аб прафесіі ўрача.

— Я вельмі любіла сельскую гаспадарку, — гаворыць Галіна Мікалаеўна, — душа «належала» зямлі.

Пасля заканчэння 8-гадовай школы Галіна вырашыла пайсці насустрач сваім марам і паступіць у сельскагаспадарчы тэхнікум. Але тата не дазволіў. І дзяўчыне прыйшлося ісці ў 9 клас. Там яна правучылася два гады, а потым зноў паспрабавала паступіць у тэхнікум. І зноў — забарона ад бацькі... Дзяўчына вырашае стаць настаўніцай хіміі і біялогіі. Але і тут ёй не шанцуе: яна не праходзіць па конкурсе. Вырашыўшы не сядзець склаўшы рукі, пайшла працаваць у «хуткую дапамогу» санітаркай.

— У нейкі момант мне так захацелася дапамагаць хворым, рабіць хоць нешта, каб зменшыць іх боль... Здаецца, нейкая невядомая сіла авалодала мной, — кажа Галіна Мікалаеўна. — І вось тады я зразумела, што хачу быць урачом.

У 1979 годзе Галіна паступіла на падрыхтоўчае аддзяленне Віцебскага мёдінстытута. І менавіта тут дзяўчына сустрэла сваё шчасце, сваю другую «палавінку». Уладзімір Мікалаевіч Цэдрык нарадзіўся ў Рэспубліцы Комі. Закончыў Варкуцінскае медвучылішча. У 1978 годзе яго сям'я пераехала ў вёску Дулебы, што на Бярэзіншчыне. Хлопец вырашыў паступаць у медінстытут на ўрача-хірурга і таксама запісаўся на падрыхтоўчае аддзяленне.

— Раней мы проста ведалі адно аднаго, — гаворыць Галіна, — але асабліва ўвагі не звярталі. Сяброўства наша пачалося, калі мы сталі студэнтамі.

А ўжо пасля другога курса маладыя людзі пажаніліся. У канцы трэцяга курса, 22 чэрвеня 1982 года, нябёсы падарылі першынца, хлопчыка Сяргея.

— Я вельмі ўдзячная бацькам мужа за тое, што дапамаглі нам вырасціць сына, бо сумяшчаць вучобу і сямейныя клопаты было нялёгка, — кажа Галіна Мікалаеўна, і слёзы ўдзячнасці з'яўляюцца на яе вачах.

Гады ішлі... Напрыканцы шостага курса нарадзілася дачка Ганна. І якраз у гэты час было размеркаванне. У 1986 годзе маладая сям'я ўрачоў прайшла інтэрнатуру ў абласной бальніцы Магілёва. А пасля было накіраванне ў Дрыбін, дзе яны адпрацавалі два гады: муж — хірургам, а Галіна, прайшоўшы курсы, — урачом-інфекцыяністам. Потым пераехалі ў Беразіно, дзе ў 1991 годзе ў іх нарадзілася дачка Марыя.

Расказваючы пра дзяцей, Галіна Мікалаеўна ўздыхае: маўляў, і не заўважыла, як праляцелі гады. Кожны з іх займаецца сваёй справай, знайшоў сваё месца ў гэтым жыцці. Сяргей жыве ў Мінску, працуе ў Белаграпрамбанку праграмістам. Ганна закончыла педагагічны ўніверсітэт з «чырвоным» дыпломам і цяпер працуе выхавальніцай у дзіцячым садку. А Марыя вучыцца на 5 курсе БДМУ. Хоча быць хірургам, як тата. Ёсць у Галіны Мікалаеўны і Уладзіміра Мікалаевіча два ўнукі. Менавіта яны зараз саграваюць сэрцы бабулі з дзядулем. Твар Галіны Мікалаеўны асвятляе шчырая ўсмешка, калі гаворка заходзіць пра іх.

**— Так атрымалася, што ў вашай сям'і два ўрачы. А гэта цяжка ўдвая. Дзеці калі-небудзь скардзіліся на тое, што ім не хапала вашай увагі?**

— Калі мы пераехалі ў Беразіно, у горадзе быў толькі адзін урач-хірург, таму муж на дзяжурствах быў часта. Дзеці мяне не бачылі па 15 сутак. Але што зробіш? Трэба было выконваць свой прафесійны доўг. І дзеці разумелі, што бацькам цяжка.

**— Скажыце, а паміж вамі і мужам калі-небудзь узнікалі медыцынскія спрэчкі?**

— Не, гэта нас абышло. Але мы і па сёння дзелімся сваімі меркаваннямі наконт якой-небудзь хваробы. Бо розныя бываюць сітуацыі. Тым больш што ў інфекцыйным аддзяленні шмат людзей з хірургічнай паталогіяй. А з іншага боку, гэта зручна, калі можна параіцца з роднаю душою. Добра, калі ёсць чалавек, які заўсёды дапаможа.

**— На ваш погляд, якая галоўная місія ўрача?**

— Несці здароўе ў кожную сям'ю. Дапамагаць, ратаваць. Умець лячыць людзей не толькі пры дапамозе лекаў, але і словам.

**— Вы можаце сказаць, што праца стала часткай вашай сутнасці?**

— Вядома, бывае, што сярод ночы прачынаешся, бо ўспамінаеш, што неабходна падрыхтаваць паперы да наступнага дня. Устаеш і робіш. І я не лічу гэта нечым анамальным. Кожнаму адмераны нябёсамі не толькі гады жыцця, але і працы. Вось і я збіраюся ісці на пенсію. Хачу займацца сваімі любімымі справамі: сям'ёй і зямлёй. Да і трэба даваць дарогу маладым. Яны цяпер іншыя, больш цямлівыя, знаходлівыя. Але ўсё роўна моладзь павінна вучыцца ў нас, пераймаць наш вопыт. Толькі тады наша краіна зможа мацнець і квітнець.

**Святлана ЧЫЖЫК,**
**вучаніца 11 класа СШ №3**
**г. Беразіно.**

### ПРА АЎТАРА

*Святлана мала таго, што вучыцца добра, дык яшчэ паспявае прымаць актыўны ўдзел у жыцці школы. Сёлета заняла першае месца ў раённай алімпіядзе па рускай і беларускай мовах. Летась перамагла ў раённых конкурсах «Вучань года» і «Лідар года».*

*У вольны ад заняткаў час 17-гадовая аўтарка спявае і танцуе. А яшчэ — захапляецца квілінгам. Гэта мастацтва вырабу плоскіх ці аб'ёмных кампазіцый са скручаных у спіральні доўгіх і вузкіх палосак паперы. Дзяўчына любіць эксперыментаваць, прыдумляць нешта новае.*

*— Лічу, што жыццё — гэта рух, таму неабходна расці, пакараць новыя вяршыні, імкнуцца да лепшага, працаваць над сабой — і ўсё атрымаецца! — кажа Святлана.*

*Дзяўчына мае запаветную мару — паступіць у Інстытут журналістыкі БДУ на спецыяльнасць «Друкаваныя СМІ». Спадзяецца, што зможа дасягнуць пастаўленай мэты.*

# «ЗАЦЯГНУЛА НІТАЧКАЙ» НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

**Вышыўка і арыгамі — адны з самых старажытных відаў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія застаюцца папулярнымі ў Беларусі (і, у прыватнасці, на Быхаўшчыне) і ў наш час. Іх развіццю спрыяе правядзенне свят-конкурсаў, выстаў раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню.**
**Тацццяна Белачкіна, загадчыца Лудчыцкага сельскага клуба, прымае актыўны ўдзел у конкурсах: «Майстар вышыўкі», «Чароўная іголачка», «Дзівосы майстроў». Яна з вялікай увагай ставіцца да захавання рамесніцкіх традыцый роднага краю. Усе яе памкненні бяруць свой пачатак з маленства.**

...Вочы баяцца, а рукі робяць. Вось і яна, Таццяна, калі пабачыла некалі вышыўкі, якія прынеслі на выставу дзеці, нават і думаць не магла, што праз нейкі час сама зробіць лепшыя. Вышыўкі тыя зрабілі бацькі дзяцей. Памятае, работы яе вельмі ўразілі, таму вырашыла паспрабаваць сама. Успомніла, што некалі ў малодшых класах вучылі вышываць крыжыкам, ды і бабулі яе вышывалі. Бацькоўская хата літаральна зззяла прыгожымі саматробнымі рэчамі. Сапраўды, а чаму б не паспрабаваць?

Па ўменні вышываць спрадвеку меркавалі пра жаночыя здольнасці і працавітасць. Сёння гэты від творчасці нібы набывае «другое дыханне». А для Таццяны вышыўка стала справай усяго жыцця. Чароўная іголачка зацягвае не толькі вышывальную нітку, паступова яна «зацягвае» і самога майстра. Узяўшы аднойчы ў рукі, паспрабаваў такую прыгожую ды цікавую працу — і не адарвешся.

Яна вышывае карціны. Работа карпатлівая: іншы раз на адну ідзе два-тры месяцы. На карціну «Прыгажуня» пайшло каля года.

Сакрэты майстэрства вядомыя толькі самому творцу. Таццяна выпісвае спецыяльныя часопісы, працуе па пэўнай схеме, па спецыяльных эскізах. Аднак хіба творчасць падпарадкоўваецца схемам!

Старанна, нязнай сабе і няспешна, «выпісвае» яна з дапамогай іголкі ды пяльцаў розныя творы. Натхненне прыходзіць у звычайных, простых вобразах-карцінках на тэму быту, дома, сям'і, дзяцей. Тое, што ёй знаёма з дзяцінства, тое, з чым сустракаецца на працы і ў штодзённым жыцці, што найбольш зразумелае і блізкае мастачцы, кладзецца на палатно. Гэта таемна і ўрачыста, гэта прыносіць найвялікшае задавальненне — на чыстае белае палотнішча выносіць сваё ўяўленне пра жыццё і перажыванні, мары і надзеі.

— Свае работы дару вельмі рэдка, — прызнаецца Таццяна. — Цяжка расставацца з рэчамі, у якія ўклаў душу, патраціў столькі часу. Дарэчы, колькі ствараецца вышыўка — тыдзень, месяц ці больш, — залежыць не толькі ад складанасці схемы ці яе памераў, але і ад настрою. Я падарыла, напэўна, не больш за дзесятак работ.

Наогул, Таццяну цікавяць і іншыя віды майстэрства: арыгамі, бісерапляценне. Асабліва прывабілі яе работы ў стылі арыгамі — выраб з папяровых загатовак стылізаваных фігур розных жывёлін, прадметаў, цэлых кампазіцый, а таксама вырабы з самых розных падручных матэрыялаў: мешкавіны, саломы, бісеру і г. д.

Творы, выкананыя цудоўным майстрам, насычаны вялікім зместам. Углядаючыся ў кожны з іх, паступова раскрываеш перад сабой багаты ўнутраны свет майстрыхі, асаблівасці яе светапогляду, тонкія душэўныя перажыванні. Кожны твор — пэўны жыццёвы сімвал, які дазваляе задумацца над галоўнымі жыццёвымі каштоўнасцямі, раскрывае шчырасць і чысціню пачуццяў.

У свой час Таццяна Рыгораўна скончыла Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай. Дзесяць гадоў яна працуе ў Лудчыцкім сельскім клубе, а сёння яшчэ і завочна вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя А.А. Куляшова.

У Лудчыцкім сельскім клубе пад кіраўніцтвам Таццяны Рыгораўны актыўна працуюць дарослыя і дзіцячыя самадзейныя калектывы, гурткі вакальнага і драматычнага кірунку, паспяхова дзейнічае дзіцячае аб'яднанне «Чарадзейны клубочак». Да стварэння і арганізацыі апошняга аб'яднання прыйшла не вельмі даўно, а штуршком сталі заняткі ў метадычным аддзеле раённага цэнтра культуры, майстар-класы аматараў самадзейнай творчасці і народных умельцаў з установ культуры і мастацтва нашага раёна.

...З замілаваннем гляджу на работы майстра — і не магу стрымаць свайго захаплення перад яе багатым унутраным светам, тонкім светаадчуваннем. Іх змест узвышае чалавека над шэрымі буднямі і раскрывае веліч жыццёвых святынь.

**Ганна ДЗЮНДЗІКАВА,**
**вучаніца 11 класа**
**Лудчыцкага ВВК**
**«Дзіцячы сад-сярэдняя школа»**
**Быхаўскага раёна.**

### ПРА АЎТАРА

*Гэтая творчая праца — увогуле першая «проба пяра» для 17-гадовай аўтаркі, як распавяла яна сама. Як і многім іншым удзельнікам конкурсу, ёй крыху дапамагла настаўніца.*

*Пасля заканчэння школы Ганна марыць стаць журналістам. Чаму такі выбар?*

*— Мне падабаецца даносіць свае думкі да людзей, прыемна, калі цябе слухаюць і разумеюць, — адказала дзяўчына.*

*Ганна захапляецца музыкай. Яна — толькі не здзіўляйцеся — вельмі любіць рок! «Для дзяўчыны гэта, напэўна, не характэрна, але мне падабаецца». У вольны час чытае мастацкую літаратуру. Асабліва цікавіцца творчасцю Купалы, Коласа, Быкава, Шамякіна, Акуніна. З любімых прадметаў у школе — грамадазнаўства, матэматыка і мовы.*

Мы — такія!

# УСІМ НЯГОДАМ НАПЕРАКОР

**Мне хочацца расказаць пра мужнага чалавека з надзвычай цяжкім лёсам, незвычайным і няпростым жыццём якога я ўражана з самага дзяцінства.**

Адам Фёдаравіч Халімончык запэўнівае: «У кожнага чалавека свой лёс, сваё жыццё, сваё прызначэнне на гэтай Зямлі. У аднаго чалавека жыццё шчаслівае, поўнае кахання, згоды, разумення. А іншаму ўвесь час не шанцуе, шмат бед і няшчасцяў здараецца. Чалавек сам каваль свайго шчасця. Але не заўсёды ўсё добра атрымліваецца. На шляху кожнага з нас сустракаюцца цяжкасці і выпрабаванні, якія трэба перанесці годна. І Бог дае чалавеку столькі нягод, колькі той зможа перажыць».

Нарадзіўся Адам Фёдаравіч у вёсцы Лутկі ў звычайнай сялянскай шматдзетнай сям'і. З самага ранняга дзяцінства прыйшлося яму працаваць, бо сям'я жыла бедна. Толькі жыццё стала наладжвацца, як грымнула Вялікая Айчынная вайна. Пачаліся новыя беды, новыя выпрабаванні. Маладых людзей у 1942 годзе вывезлі ў Германію. Сярод іх быў і Адам Фёдаравіч. Везлі ў таварных вагонах у антысанітарных умовах, без ежы, без вады. Многія паміралі ў дарозе — іх проста выкідвалі з вагонаў. Цяжкахворага Адама прывезлі ў Заходнюю Германію. Некалькі дзён ён быў без прытомнасці, але праз некаторы час пайшоў на папраўку.

Калі Адам стаў канчаткова на ногі, яго адправілі працаваць на завод у гарачы цэх. Праца была вельмі цяжкай, небяспечнай для здароўя і жыцця. І вось няшчасце: моцна апёк нагу. Вердыкт мясцовых урачоў быў няўмольным: «Калі жадаеш жыць, трэба ампутаваць нагу да калена». Спачатку Адам не згаджаўся, бо спадзяваўся на лепшае. Але не абышлося, нагу прыйшлося ампутаваць, бо пачалася гангрэна. 18 верасня 1943 года васямнаццацігадовы юнак застаўся без нагі... Як жыць, тым больш у чужой краіне? Ад каго чакаць дапамогі? Адам увесь час маліўся Богу, прасіў дапамогі ў яго і верыў, што яго малітвы пачуе Усявышні...

...Па волі лёсу Адам апынуўся ў калоне, якая накіроўвалася ў Заходнюю Германію. Амерыканцы беспярапынна бамбілі. Хворая нага пачала кровачачыць. Каб пазбегнуць ускладненняў, яго адправілі ў шпіталь у Кёльн. Потым Адам апынуўся ў нямецкім лагеры, які размяшчаўся ў Альпах: немцы загадзя пабудавалі ў гарах тунэль. Там і ратаваліся ад бамбёжак. Кожны дзень прыбывалі новыя людзі, найперш — нямецкія жанчыны і дзеці.

Аднойчы, калі ўсе выйшлі з хованкі, пачалася бамбёжка. Ішоў моцны праліўны дождж, было вельмі холадна. Шмат людзей захварэла і памерла. Цяжка захварэў і Адам — застудзіўся. Але яго падабралі амерыканцы і адправілі ў шпіталь. Тут юнака лёс звёў з рускім палкоўнікам медыцынскай службы. Ён і выратаваў Адама ад вернай смерці. Здавалася б, усё самае цяжкае засталося ў мінулым, але нечакана шпіталь пачалі бамбіць. Загінула больш за тысячу чалавек. Тры дні вывозілі параненых і забітых. «І сёння перад маімі вачамі стаіць яма, у якую, як дровы, складвалі людзей, каб пахаваць», — успамінае ён.

Адам Фёдаравіч таксама быў у ліку параненых. Зноў невыносныя пакуты, зноў аперацыя, боль і кроў. «Калі ж гэта ўсё скончыцца? — думаў хлопец. — Калі ж будзе доўгачаканы Дзень Перамогі?» І вось нарэшце — май 1945 года... Але ў Адама Фёдаравіча настрой быў азмрочаны раненнем, якое ўвесь час нагадвала пра сябе: нага моцна балела. Зноў паўстала пытанне аб ампутацыі — другой нагі... Да лютага 1946 года малады чалавек лячыўся ў нямецкім шпіталі. Вярнуўся дадому толькі ў красавіку. Вакол былі разруха, холад і голад. «Што я буду рабіць? Як жыць далей? Каму я патрэбны?» — усё часцей і часцей думаў Адам. Але прыйшло шчасце і да яго. Ён сустрэў Вольгу. Маладыя людзі шчыра пакахалі адно аднаго. Усё-такі ўзнагародзіў яго Бог за пакуты. Пажаніліся ў 1949 годзе. Спачатку было цяжка. Але паступова жыццё пачало наладжвацца. Кіраўніцтва калгаса зразумела клопаты і складаныя жыццёвыя абставіны маладой сям'і: Адаму далі працу па яго фізічных магчымасцях. Разам выгадавалі дваіх дзяцей. Потым з'явіліся шасцёра ўнукаў, трынаццаць праўнукаў.

...Дзеці жывуць у роднай вёсцы Лутկі, кожны дзень наведваюць свайго бацьку, дапамагаюць. Унукі і праўнукі жывуць у Жыткавічах. Таксама часта прыязджаюць, наведваюць дзядулю. «Яны для мяне самыя лепшыя, самыя прыгожыя. Я вельмі ганаруся імі. Ды і як імі не ганарыцца, калі яны ўсе працавітыя, гаспадарлівыя, разумныя, клапатлівыя? Дзякуй ім за тое, што яны не забываюць мяне, старога! Узнагародзіў Бог мяне за мае пакуты і выпрабаванні. Шкада, што цяпер жыву адзін. Памерла мая жонка — самы дарагі для мяне чалавек, з якім я дзяліў усе свае радасці і няшчасці, добрыя і дрэнныя навіны. Дзякуй ёй за тое, што не пабаялася пайсці замуж за мяне, інваліда, не спужалася цяжкасцяў. Сумна, дрэнна мне без яе...» — гаворыць Адам Фёдаравіч.

«Жывіце, дзеткі, жывіце шчасліва, годна! Няхай заўсёды будзе над вамі мірнае блакітнае неба! Няхай заўсёды вас суправаджаюць радасць, дабрабыт і поспех, і каб войны зніклі назаўжды! — працягвае ён, а потым, задумаўшыся, дадае: — Жахі, якія мы перажылі, ніколі не павінны больш паўтарыцца».

Гляджу на гэтага мудрага, ужо старога, спакутаванага жыццёвымі нягодамі чалавека, які пражыў такое цяжкае жыццё, і думаю: «Якім жа трэба быць моцным і мужным, каб перажыць такія нягоды і застацца ў душы добрым, уважлівым і шчырым чалавекам, Чалавекам з вялікай літары!». Хачу пажадаць Адаму Фёдаравічу даўгалецця, здароўя, шчасця, каб з ім заўсёды побач былі добрыя і шчырыя людзі!

**Вераніка СЦЯМПКОЎСКАЯ, вучаніца 11 класа ДУ «Хільчыцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа» Жыткавіцкага раёна.**

## ПРА АЎТАРА

*— Я жыву ў суседняй ад школы невялікай маляўнічай і надзвычай прыгожай вёсачцы Лутկі. Вёскі Лутկі і Хільчыцы знаходзяцца на памежжы Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Вельмі люблю сваю малую радзіму, таму што тут жылі мае продкі, тут выраслі мае тата і мама. Маё дзяцінства таксама прайшло ў роднай вёсцы, — расказвае наша чарговая 16-гадовая аўтарка. — Я вучуся добра, паспяваю па ўсіх прадметах, але асабліва мне падабаюцца гуманітарныя навукі. Таму стараюся ўдзельнічаць у розных конкурсах, асабліва творчых, і пішу артыкулы ў мясцовыя газеты. Ужо маю шмат публікацый. У вольны ад вучобы час я наведваю мастацкую студыю, а таксама захапляюся музыкай і танцамі. Люблю паслухаць розныя цікавыя гісторыі, асабліва ад сталых, умудроных жыццёвым вопытам людзей.*

*Вераніка марыць стаць журналістам: ёй вельмі падабаецца гэтая прафесія.*

# У «СУЗОР'І» ЮНЫХ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

**Мяне з дзяцінства прыцягвалі пазітыўныя, энергічныя і працавітыя людзі. Такім чалавекам у сярэдняй школе №4 г. Навагрудка з'яўляецца педагог-арганізатар першай катэгорыі Людміла Андрэеўна Бузук. З ёю заўсёды цікава, таму дзеці імкнуцца прымаць удзел ва ўсіх мерапрыемствах, да якіх яна мае дачыненне.**


Людміла Андрэеўна Бузук і каманда «Сузор'е».

Я ведала, што Людміла Андрэеўна з'яўляецца кіраўніком інтэлектуальнага клуба нашай школы «Савяня». І вось аднойчы, калі я была ў сёмым класе, яна прапанавала мне і маім сяброўкам паспрабаваць стварыць сваю каманду інтэлектуалаў.

Першым чынам мы прыйшлі на трэніроўку да старэйшай каманды — «Войска Міндаўга». Нас вельмі захапіў іх энтузіязм, тое, як яны адказвалі на пытанні, працавалі ў камандзе. Мы даведаліся пра іх высокія вынікі ў інтэлектуальных гульнях: каманда «Войска Міндаўга» (капітан К. Каралько) у 2011 годзе заняла трэцяе месца ў гульні «Медыязбука», а ў 2012-м — у гульні «Што? Дзе? Калі?» на абласным інтэлектуальным фестывалі «Кубак Кронана».

Нам таксама захацелася стаць пераможцамі, і з таго часу мы пачалі займацца інтэлектуальнымі гульнямі. Была створана каманда «Сузор'е» ў складзе Соф'і Забялінскай (капітан), Ульяны Двілевіч, Аляксея Ходара, Цімура Цямірава, Андрэя Дзедаўца, Кірыла Лапіцкага і мяне — Дар'і Ждан.

Нам шанцавала з першых гульняў: мы адразу пачалі займаць прызавыя месцы ў сваёй узроставай катэгорыі. Нашы высокія дасягненні — вынік сумленнай працы, сур'ёзнага стаўлення да трэніровак. Але не ўсё так проста, як здаецца. У нас не адразу атрымлівалася дружна працаваць у камандзе. Не ведаю, засталася б увогуле каманда, калі б не Людміла Андрэеўна. Яна заўсёды вучыла нас не вінаваціць у паражэнні некага аднаго, а адказна працаваць усім разам. Гэта дапамагае нам не баяцца адказваць на самыя цяжкія пытанні і спакойна ставіцца да памылак. Калі сустракаюцца цяжкасці і перашкоды, мы заўсёды падтрымліваем адно аднаго.

Сёння інтэлектуальныя гульні займаюць у нашым жыцці вялікае месца. Мы шмат трэніруемся, чытаем даведнікі, кнігі, абмяркоўваем пытанні. Вядома, не абыходзіцца без гумару і цікавых зносін. Пасяджэнне клуба — заўсёды творчы працэс, дзе меркаванне кожнага слухаюць з увагай. І ўсё гэта дае добрыя вынікі. У гэтым навучальным годзе каманда 9-х класаў «Сузор'е» заваявала 1 месца ў раённым этапе 16-га абласнога турніру гульні «Што? Дзе? Калі?». Каманда 7-х класаў «Пазітыў» (капітан Анжаліка Лішко) заняла першае месца, а каманда «Цудоўная шасцёрка» 8-х класаў (капітан Сафія Рафаловіч) — трэцяе ў раённым турніры 1-га рэспубліканскага чэмпіянату гульні «Што? Дзе? Калі?» сярод піянерскіх дружын.

Вялікі дзякуй за гэта шаноўнай Людміле Андрэеўне, бо яна сапраўдны кіраўнік і стваральнік нашага клуба.

**Дар'я ЖДАН, вучаніца 9 класа СШ № 4 г. Навагрудка.**

## ПРА АЎТАРА

*— Вырашыла прыняць удзел у конкурсе «Мы — такія!..», — распавяла пра сябе 14-гадовая Дар'я. — Я захапляюся музыкай, неўзабаве скончу школу мастацтваў, добра спяваю і вельмі люблю родную мову. У гэтым навучальным годзе заняла другое месца ў раённай алімпіядзе па беларускай мове, спрабую сябе ў якасці журналіста. Прымаю актыўны ўдзел у школьным жыцці: займаюся ў інтэлектуальным клубе «Савяня», выступаю на творчых конкурсах. У верасні мяне абралі членам абласнога Маладзёжнага парламента ад нашага горада. Я актыўная і добразычлівая, імкнуся дапамагаць аднакласнікам, сябрам.*

# ПТУШКА ПРЫГОЖАЯ ПЕР'ЕМ, А ЧАЛАВЕК — ВЕДАМІ

**Адукаваны чалавек — гэта прыклад для пераймання. Сваімі ведамі ён не толькі заслугоўвае павагу ў грамадстве, але і стварае падмурак для будучай паспяховай самарэалізацыі. Мая суразмоўца — цікавая дзяўчына, у асобе якой гарманічна спалучаецца знешняя і ўнутраная прыгажосць. Дзевяцікласніца Дар'я Кулік з ліку тых людзей, якімі па праве ганарыцца наша школа.**



***— Дар'я, летась ты стала пераможцай раённай алімпіяды. Раскажы, калі ласка, пра свой поспех...***

— Сапраўды, у канкурэнтнай барацьбе я здабыла першае пераможнае месца па геаграфіі, другое — па біялогіі і трэцяе — па хіміі. Было нялёгка, таму што рыхтавацца да выпрабаванняў па гэтых прадметах даводзілася амаль што адначасова.

***— Чаму выбрала менавіта гэтыя прадметы?***

— Мне падабаюцца геаграфія і біялогія, ды і з хіміяй сябравацъ атрымліваецца. Геаграфія захапіла адразу, бо ўзяла верх цікавасць да ўсяго, што існуе вакол нас. Імкнуся кожны дзень паглыбляць свае веды...

***— А якія прадметы са школьнага раскладу прыцягваюць тваю ўвагу не менш за вышэйзгаданыя?***

— Англійская мова, алгебра, гісторыя, руская мова. Іх я добра разумею. Дарэчы, замежнай мовай займаюся даволі працяглы час і імкнуся да свабоднага валодання ёю.

***— Дар'я, ці ёсць у цябе хобі?***

— З задавальненнем чытаю фантастычную і прыгодніцкую літаратуру, выконваю любімыя кампазіцыі на піяніна, калі падобнае можна назваць хобі.

***— Ці ўзнікалі ўжо думкі наконт выбару прафесіі?***

— Мая мара — асвоіць перакладчыцкую спецыяльнасць. Я планую ажыццявіць пасля заканчэння дзявятага класа.

***— Што цябе больш за ўсё прываблівае ў алімпіядах?***

— Магчымасць праверкі ўласных ведаў.

***— А што выклікае цяжкасці пры рашэнні заданняў?***

— Успомніць тое, што ведаеш, у вызначаны прамежак часу.

***— Якія парады, на тваю думку, будуць карыснымі для тых, хто вырашыць прыняць удзел у алімпіядах?***

— Па-першае, аднесціся да выпрабаванняў сур'ёзна, рыхтавацца загадзя і не выключаць самападрыхтоўку з агульнага працэсу.

**Ірына ЕРАМІН, вучаніца 8 класа СШ № 2 г. Беразіно. Фота аўтара.**

## ПРА АЎТАРА

*Ірына любіць маляваць, марыць навучыцца рабіць гэта прафесійна. Яшчэ ёй падабаецца музыка — у вольны час яна вучыцца іграць на піяніна. Член школьнага клуба «Юны журналіст».*

*— Люблю плаваць. Вельмі рада, што ў нашым горадзе хутка адкрыецца басейн, тады я змагу плаваць у любую пару года, — расказала пра свае захапленні 14-гадовая аўтарка. — Летам з сябрамі, якіх вельмі шаную і з якімі мне прыемна бавіць час, з задавальненнем катаюся на ролiках. Мая любімая гульня — бадмінтон.*

*Дзяўчыне падабаецца фантастыка і дэтэктывы, а таксама фільмы гэтых жанраў. Ірына добра вучыцца, марыць, каб будучая прафесія была звязана з хіміяй.*

## Извещение о проведении повторных аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел. - кадастр.док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | № 131 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-4» | 1028331 | 0,1374 | строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | 10 | 149 544 993 | 29 900 000 | 9 593 766 | 0,0063 га – охранная зона линии связи |
| 2 | № 132 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-4» | 1028332 | 0,2035 | строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | 10 | 221 487 672 | 44 290 000 | 9 593 766 | 0,0075 га – охранная зона линии связи |
| 3 | № 133 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-4» | 1028333 | 0,1522 | строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | 10 | 165 653 188 | 33 130 000 | 9 027 347 | 0,0096 га – охранная зона линии связи |
| 4 | ул. Писателя Смирнова, 147/1 | 1028334 | 0,1029 | строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей | 10 | 41 074 316 | 8 200 000 | 8 837 198 | 0,0218 га – охранная зона сетей и сооружений канализации и 0,0062 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения |
| 5 | на пересечении ул. Волгоградской и ул. Луцкой | 1028335 | 0,0136 | строительство и обслуживание объекта розничной торговли белорусской косметики | 10 | 15 591 899 | 3 100 000 | 16 604 742 | ограничений в использовании земель нет |
| 6 | в районе ул. Героев обороны Брестской крепости | 1028336 | 0,3861 | строительство и обслуживание производственного здания по ремонту колесных тележек | 10 | 382 328 699 | 76 460 000 | 13 248 281 | 0,0009 га – охранная зона подземной кабельной линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 7* | в районе «ЮЗМР-3» №№ 39, 40, 41 (по ГП) | 1025055 | 1,2077 | строительство и обслуживание многоквартирного жилого дома | 5 | 627 497 689 | 125 490 000 | 1 244 233 | ограничений в использовании земель нет |
| 8* | между ул. Октябрьской Революции и ул. 28 Июля | 1020990 | 3,5375 | строительство и обслуживание объекта торгово-развлекательного назначения, административного назначения, гостиницы с условиями создания на прилегающей территории ландшафтно-рекреационной зоны | 10 | 3 476 686 710 | 695 330 000 | 3 143 097 | ограничений в использовании земель нет |
| 9* | ул. 2-я Белорусская | 1019335 | 0,8704 | строительство и обслуживание объекта производственного назначения | 10 | 392 619 593 | 78 520 000 | 1 450 817 | 0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 10* | в районе ул. Волгоградская | 1025064 | 0,2967 | строительство и обслуживание спортивных сооружений | 10 | 270 164 398 | 54 030 000 | 1 306 845 | ограничений в использовании земель нет |
| 11* | ул. Воинов-интер-националистов, 19 | 1019530 | 0,0673 | строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания | 10 | 74 897 468 | 14 970 000 | 5 795 970 | 0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 12* | ул. Высоковская | 1027693 | 0,4733 | строительство и обслуживание объекта питания с общественно-бытовыми помещениями | 10 | 540 417 481 | 108 080 000 | 5 941 339 | ограничений в использовании земель нет |
| 13* | ул. М.Л. Мошенского | 1025787 | 0,9446 | строительство и обслуживание автостоянки | 10 | 764 560 674 | 152 900 000 | 1 513 733 | 0,0060 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 14* | ул. Базановой, 4 | 1026802 | 0,0187 | установка и обслуживание объекта торговли | 10 | 32 702 253 | 6 540 000 | 1 407 198 | 0,0032 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000В; 0,0056 га – охранная зона водопровода |
| 15* | ул. Красногвардейская | 1026816 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 1 | 10 | 2 377 623 | 475 000 | 1 529 617 | 0,0002 га охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 16* | ул. Красногвардейская | 1026817 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 2 | 10 | 2 377 623 | 475 000 | 1 001 905 | 0,0021 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 17* | ул. Красногвардейская | 1026818 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 3 | 10 | 2 377 623 | 475 000 | 1 001 905 | ограничений в использовании земель нет |

**дополнительное условие: по лоту № 6 – возмещение суммы убытков, причиненных УП «Брестское отделение Белорусской железной дороги» изъятием земельного участка в размере 67 608 000 рублей**
*** – повторные аукционные торги**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881.

• в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;

• в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;

• приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).

**Аукцион состоится 20 мая 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 14.04.2014 г. до 17.30 14.05.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by**

Минский городской центр недвижимости

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

## 14 мая 2014 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями № 03-У-14 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Минске на 4 земельных участках, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Функциональное назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | На пересечении ул. Я Мавра – ул. Пономаренко | 3,2300 | многоэтажный жилой комплекс повышенной комфортности со встроенными помещениями общественного назначения и паркингом | 7 023 005 440 | 1 400 000 000 | 206 562 798 | снос и отселение жилых домов по ул. Пономаренко, 14, 16, 18, 20, 22 и по ул. Я. Мавра, 64а, 68а, 68б, 68в, 70, 68г | 84 203 823 600 |
| 2 | На пересечении ул. Либкнехта и ул. Лермонтова | 0,4602 | жилой дом со встроенными объектами обслуживания и подземным паркингом на 60 машино-мест (с условием строительства жилого дома повышенной комфортности) | 1 036 858 480 | 207 000 000 | 59 962 674 | снос и отселение жилых домов по ул. К. Либкнехта, 89, 91 по ул. Лермонтова, 41 | 15 631 860 000 |
| 3 | ул. Уборевича | 4,3163 | жилая многоквартирная застройка (с условием строительства жилого дома повышенной комфортности) | 7 660 122 080 | 1 500 000 000 | 138 946 515 | снос и отселение жилых домов по ул. Копыльской, 43, 45, 55, 57, 63, 65, 67, 69, 70, 71, 73, 74, 78, 80, 81, 82, 83, 86 ул. Столбцовской, 52, 54, 58, 60, 62, 68, 70, 72, 80, по проезду Клецкому, 4, 5 | 36 490 020 000 |
| 4 | На пересечении ул. Калинина и ул. К.Чорного | 0,4200 | комплекс, включающий многоквартирный жилой дом со встроенными нежилыми помещениями, административным зданием и подземным паркингом (с условием строительства жилого дома повышенной комфортности) | 1 022 250 180 | 200 000 000 | 98 601 007 | снос и отселение жилых домов по ул. Калинина, 16/22, 14, ул. К. Чорного, 24, 26 | 43 583 229 000 |

Основные условия проектирования и строительства объектов указаны в актах выбора места размещения земельных участков и прилагаемой к ним документации.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанном земельном участке и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Аукцион состоится 14 мая 2014 года в 11 час. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 7 мая 2014 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 14 апреля по 7 мая 2014 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

С победителем аукциона либо с единственным участником несостоявшегося аукциона, выразившем согласие на внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, заключается договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решения об изъятии и предоставлении ему соответствующего земельного участка до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

Оплата стоимости предмета аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не ранее заключения с организацией по землеустройству договора подряда на разработку проекта отвода земельного участка, но не позднее одного рабочего дня после получения землеустроительной службой Минского горисполкома материалов об изъятии и предоставлении земельного участка.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) и договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды на земельный участок подлежат государственной регистрации в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельному участку (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

# ПАЖАНІЦЦА Ў 20

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Што ж, не пярэчыць жонцы — мудрае рашэнне. У 21 год (а менавіта па столькі цяпер Максіму і Юлі) такі падыход сустрэнеш рэдка. Ды і далёка не ва ўсіх у такім узросце ёсць свая сям'я.

Каб саспела рашэнне яе стварыць, нашым героям спатрэбілася паўтара года.

— Што сказаць, сціплая дзяўчына, нейкая «мышка» — прыкладна такім было маё першае ўражанне пра Юлю, — кажа Максім. І зноў становіцца незразумела: праўда гэта ці ён жартуе?

Маладая жонка не адстае:

— Каб мне нехта тады сказаў, што ён будзе маім мужам, я не паверыла б.



Гатаваць маладой жонцы даводзіцца на агульнай кухні, а вось карміць мужа — заўсёды ў сваім пакоі.

Спачатку яны проста вучыліся на адным патоку на факультэце энергетычнага будаўніцтва. Максім вывучаў будаўніцтва цеплавых і атамных электрастанцый, а Юля — водных шляхоў і партоў. Ператварэнне «сціплай мышкі» ў самую мілую прыгажуню і незнаёмца з патоку ў надзею і апору па жыцці адбылося нечакана. Юля і Максім пасяліліся ў адным інтэрнаце. З'явілася жаданне ведаць адно пра аднаго як мага больш. Юля, напрыклад, прыехала ў Беларусь з Прыднястроўя, з Цiраспаля. Бацькі Юлінай мамы спачатку жылі ў Беларусі. Праз нейкі час сям'я пераехала ва Украіну, на радзіму дзеда Юлі. Так атрымалася, што пазней ім далі жыллё ў Цiраспалі, пасля чаго сямейнае «падарожжа» на нейкі час спынілася. Працягнула яго ўжо прадстаўніца маладога пакалення. Юля ехала ў Беларусь мэтанакiравана: паступіць ва ўніверсітэт і атрымаць дыплом. А знайшла яшчэ і мужа.

— Я меркавала, што, калі атрымаецца з вучобай, пастараюся ў Беларусі застацца. Да гэтага я ўжо была ў Мінску, бо тут жывуць сваякі. Мне ў гэтым горадзе падабаецца многае. Тым больш, што і мама з татам цяпер недалёка: перабраліся жыць у Смаленск.

— Яшчэ да таго, як прапанаваў Юлі ўзяць шлюб, я неяк нечакана пазнаёміўся з яе татам, — распавядае Максім. — Нашы адносіны, так бы мовіць, толькі пачыналіся, і тут ён прыехаў да Юлі. Яна, зразумела, асцярожна так мяне прадставіла: «Гэта Максім». Пасля чаго бацька ёй так ціхенька заўважыў: «Ты глядзі, хлопец ён добры!» Як разумная дачка, яна тату паслухалася.

**Пра магчымасць стварэння сям'і ў студэнцкім узросце ён думаў. Бацькі ж таксама ажаніліся досыць маладымі, таму рашэнне сына падтрымалі. А вось сябры Максіма да змен у яго жыцці аднесліся неадназначна.**




На самым ганаровым месцы — вясельная фатаграфія і прызнанне ў каханні.

Максім прыехаў у Мінск з Гродзеншчыны, з Бярозаўкі. Кажа, што пра магчымасць стварэння сям'і ў студэнцкім узросце ён думаў. Бацькі ж таксама ажаніліся досыць маладымі, таму рашэнне сына падтрымалі. А вось сябры Максіма да змен у яго жыцці аднесліся неадназначна: некаторыя жартавалі, намагаючыся даведацца, ці ёсць у вяселля «прычына»; некаторыя проста дзівіліся, што малады хлопец настолькі лёгка развітваецца з халасцяцкім жыццём.

Вяселле згулялі на «нейтральнай тэрыторыі», у Мінску. А далей быў першы самастойны сямейны крок — пошук жылля. Пра магчымасць пасяліцца ў студэнцкім інтэрнаце ўжо як сям'я Максім і Юля пачалі пытацца яшчэ да вяселля. Пасля хуценька сабралі ўсе неабходныя дакументы і ў мінулым кастрычніку сталі шчаслівымі «ўладальнікамі» пакоя ў адным з блокаў інтэрната БНТУ № 15. Тут, дарэчы, жыве не адна студэнцкая сям'я. Ванную і санвузел даводзіцца дзяліць з жыхарамі суседняга пакоя, а кухня — агульная адразу для некалькіх пакояў. Цікаўлюся, ці не цяжка было рэзка пераключыцца са студэнцкага жыцця на сямейнае. Усё ж тут больш абавязкаў, а адгаворкі ў стылі «зраблю заўтра» толькі шкодзяць. Максім зноў здзіўляе адказам:

— Калі стаў сямейным чалавекам, наадварот, больш расслабіўся. Бытавыя складанасці, якія належыць «ліквідаваць» мужчыну, не адбіраюць шмат часу. Цвік які прыбіць хіба доўга?

У плане грошай маладым дапамагаюць бацькі — без гэтага пакуль ніяк. Але, калі здараецца магчымасць падзарабіць, Максім ёй карыстаецца:

— Падпрацоўваць я спрабаваў яшчэ на першым курсе: грошы ніколі лішнімі не бываюць, — кажа хлопец. — Вядома, студэнту, занятаму вучобай, цяжкавата знайсці пастаяннае месца, таму пакуль што «працоўныя подзвігі» даводзіцца здзяйсняць, працуючы, напрыклад, грузчыкам. Усё ж які-ніякі даход. Летам яшчэ можна на будоўлю ўладкавацца.

Юля ж распавядае пра прынцыпы рацыянальнага кіравання сямейнымі даходамі. Ніякіх хітрых сістэм: маладая сям'я проста стараецца не выдаткоўваць грошы на непатрэбнае, планаваць загадзя вялікія пакупкі, прыглядацца да крам, дзе больш выгадныя цэны. Праўда, пара прызнаецца, што ў кожнага з іх ёсць маленькія слабасці: Максім любіць пагуляць на камп'ютары ў «танкі», што хоць грошай і не аднімае, затое забірае нямала часу, а Юля не можа спакойна прайсці міма крам з біжутэрыяй. Тым не менш матэрыяльныя цяжкасці не вельмі турбуюць маладую сям'ю.

Не перашкаджае «змена статусу» і адпачываць:

— Наш лад жыцця пасля вяселля змяніўся мала. Мы з Максімам «дамаседы», таму сумаваць па начных клубах не прыйшлося. Мы і так не былі асаблівымі прыхільнікамі «адрывацца па поўнай». А паклікаць у госці сяброў і цяпер нічога не перашкаджае, — распавядае Юля.



Пакуль Юля збіраецца на «пары», Максім цярпліва чакае жонку.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Па словах дзяўчыны, новы сямейны статус ніяк на яе характар не паўплываў, але тут у размову ўмяшаўся муж:

— Хіба што з маімі аднакурсніцамі яна цяпер больш строгая.

Юля не разгубілася і тут жа ўсё патлумачыла:

— Сапраўды, ёсць некалькі дзяўчат, што могуць, не саромеючыся, падысці да Максіма, абняць ці пачаць адкрыта «строіць вочкі». Зразумела, мне непрыемна.

З гэтага моманту размова неяк плаўна пераходзіць на стаўленне сучасных хлопцаў і дзяўчат да сям'і ўвогуле:

— Не магу казаць за ўсю моладзь, але большасць маіх знаёмых прытрымліваецца меркавання, што не абавязкова афіцыйна афармляць адносіны — дастаткова проста жыць у грамадзянскім шлюбе, — разважае Максім.

Юля мае на гэты конт свой погляд:

— Такіх адносін я не хацела б. Мне, як і любой дзяўчыне, было б складана чакаць ад каханага сур'ёзнага кроку яшчэ некалькі гадоў. Таму я вельмі рада, што ў нас з Максімам сапраўдная сям'я.

А яшчэ дзяўчына ўпэўнена, што грошы, маёмасць і іншыя атрыбуты «стабільнага дарослага жыцця» — гэта справа нажыўная.

— Я сама жыла да пяці гадоў з бацькамі ў інтэрнаце, і ў мяне няма ніякіх негатыўных успамінаў пра гэты час: заўжды было цікава, весела, шмат сяброў. Але мы плануем дзіця ў будучым, не ў бліжэйшы час. Усё ж, пакуль мы не працуем, а вучоба патрабуе шмат увагі, — распавядае Юля.

Цікава, што чэргам на жыллё і льготам для маладых сем'яў Юля і Максім не надаюць асаблівай увагі.

— Для нас такі варыянт будзе надта доўгім таму, што Юля не мае беларускага грамадзянства, — тлумачыць Максім. — У будучым атрымаем дыпломы, пойдзем працаваць і паспрабуем неяк самі вырашыць гэтае пытанне.

Магчыма, хтосьці з чытачоў і засумняваецца ў рэальнасці «райскага» сямейнага жыцця ў студэнцкім інтэрнаце. Кожны, хто хоць раз жыў там, назаве не адзін мінус. Можна меркаваць і так, але Юля і Максім бачаць у сваёй сітуацыі толькі адзін вялікі плюс — яны цяпер разам.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

*«Каштоўны» вопыт*

# СТУДЭНЦКІЯ ШАНЦЫ ЗБЕРАГЧЫ ФІНАНСЫ




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**— Я прывабная дзяўчына, бо грошы трачу толькі на адзенне і касметыку. З гэтай прычыны амаль нічога не ем, «харчуюся паветрам». Таму ў мяне яшчэ і фігура зграбная! — ці то смехам, ці то ўсур'ёз дзялілася сваім «вопытам эканоміі» студэнтка ў адной з сацыяльных сетак.**

**Насамрэч цяперашнія «грызуны» граніту навукі ў большасці сваёй не сядзяць галоднымі. І ўсё ж грошы лішнімі не бываюць. Якія самыя вядомыя студэнцкія спосабы патраціць як мага менш грошай?**

## Без клубаў, але з «інвестыцыямі»

Маша вучыцца на трэцім курсе медыцынскага ўніверсітэта. Сумяшчаць вучобу з працай пакуль няма магчымасці, а таму асноўныя крыніцы «даходу» — стыпендыя з даплатай за выкананне абавязкаў старасты (каля 1,1 мільёна рублёў) і грошы бацькоў.

— Першае, на чым я звычайна эканомлю — гэта ежа, — распавядае Маша. — Я рэдка хаджу ў кавярні і нават у сталовую.

Прыкладна раз на два тыдні дзяўчына атрымлівае гасцінцы з дому. Акрамя грошай, мама перадае ёй хатнія катлеткі, пірагі, агародніну.

Наступная графа выдаткаў, якая магла б здарыцца, — адзенне. Тут Маша робіць досыць хітра: студэнты-медыкі шмат якія заняткі павінны наведваць у белых халатах. Астатні гардэроб у такім выпадку можа быць лаканічным — пара джынсаў, світараў, блузак і спадніц. А калі нейкая новая рэч становіцца тэрмінова неабходнай, у нашай студэнткі ёсць старэйшая сястра, у якой час ад часу можна «пазычыць» сукенку ці кофтачку.

Апошняя графа выдаткаў — гэта адпачынак.

— З суседкай мы часам ходзім у кіно ці тэатр, звычайна пасля стыпендыі, а вось клубы я не люблю, пасля напружанай вучобы ноччу хочацца спаць, а не танцаваць, — расказвае Маша.

Такі падыход да расходавання грошай дазваляе ёй не эканоміць на здароўі (калі раптам узнікае неабходнасць наведаць платнага стаматолага, гэта не здаецца катастрофай), а яшчэ, на думку Машы, не варта эканоміць на «інвестыцыях» у будучыню, і пакуль ёсць магчымасць, паралельна з вучобай трэба наведваць як мага больш розных курсаў. Масаж, кройка і шыццё — ды што заўгодна.

## Даеш «разгрузачныя» дні!

Будучы настаўнік фізкультуры Арцём вучыцца на ўніверсітэце аднаго з абласных цэнтраў. Другакурснік жыве ў інтэрнаце, а на выхадныя часцей за ўсё наведваецца да мамы з татам, што жывуць прыкладна за 150 кіламетраў ад горада.

— Калі ўлічваць толькі мае патрэбы, то за дзень магу траціць не больш за 30 тысяч рублёў. Гэтыя грошы ідуць на «перакусы» і розныя дробязі. Але часам трэба схадзіць пагуляць з каханай дзяўчынай, тут ужо гэтай сумы будзе недастаткова, — расказвае хлопец пра рух сваіх «фінансаў».

Стыпендыя ў Арцёма не такая вялікая — каля 500 тысяч рублёў. Бацькі на тыдзень даюць прыкладна 200 тысяч, калі не плануецца нейкіх вялікіх пакупак. З чаго ж пачынаецца эканомія? Зразумела, зноў-такі з ежы...

— Першыя дні тры пасля вяртання з дому я магу ўвогуле не хадзіць у краму, хіба што па хлеб, — распавядае хлопец.

Адзенне на працягу года набываецца рэдка. Каб сэканоміць, мінулым летам Арцём з бацькамі ездзіў ва Украіну. Хлопец кажа, што калі адразу купіць дзве пары джынсаў, некалькі кашуль, футболак, світараў, туфлі, кеды і красоўкі, то цягам года дакупіць прыйдзецца хіба што зімовы абутак і пару цёплых рэчаў.

— Я магу дазволіць сабе пайсці з дзяўчынай у кіно, у клуб, з'ездзіць з сябрамі на прыроду, са стыпендыі адкладваць на новы тэлефон. Жыць трэба так, як падабаецца. Але пасля такіх «нечаканых» выдаткаў заўжды намагаюся патрачаную суму ўзнавіць, — расказвае Арцём.

Робіць гэта хлопец дзякуючы падпрацоўцы грузчыкам. За адну разгрузку можна зарабіць ад 80 да 100 тысяч рублёў.

## «Сезоннае» жыццё са зніжкамі

Ірына ўжо трэці год вучыцца ў Варшаве. Якія ў дзяўчыны спосабы сэканоміць?

— Як студэнтка я набываю льготныя квіткі на праезд у транспарце, у музеі, кіно, тэатр, а паколькі ўсё гэта тут каштуе нятанна, то ў выніку сэканомленая сума атрымліваецца досыць вялікай, — распавядае Ірына.

Што датычыць іншых пакупак, то ў супермаркетах амаль штодзённа робяць зніжкі на які-небудзь тавар. Па словах дзяўчыны, у гэтых акцыях няма нічога агульнага са спробай хутчэй прадаць тое, у чаго неўзабаве скончыцца тэрмін прыдатнасці.

— Калі сачыць за сезоннымі распродажамі, можна добра сэканоміць на адзенні, што я і раблю, — тлумачыць студэнтка. — Таксама карыстаюся рознымі сайтамі, на якіх змешчана інфармацыя пра ўсе зніжкі ў горадзе. На іх, дарэчы, выгадна набываць абанемент у спартзалу і на розныя курсы (ад малявання да замежных моў).

Калі гаварыць пра падарожжы, тут сэканоміць Ірыне дапамагае звычка планаваць свой маршрут загадзя. Білеты і начлег для такіх «спрытных» падарожнікаў абыходзіцца ў шмат разоў танней, калі браніраваць і ўносіць аплату за месяц-два да паездкі. Так дзяўчына пабывала, напрыклад, у Берліне і Дрэздэне. Прычым выдаткі на вандроўку зусім не падарвалі бюджэт студэнткі, якая жыве выключна на стыпендыю, не разлічваючы асабліва на дапамогу бацькоў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

SEX=БАЛЯСЫ

# Я Ў ЦЯБЕ НЕ ТАКІ!

**Днямі адчуў на сабе нейкі крыху здзіўлены позірк дзяўчыны-бландзінкі — кіроўцы БМВ. Але напачатку не надаў гэтаму асаблівай увагі: паглядзела — і паглядзела. Марку іншай машыны разгледзець не паспеў, бо сустрэўся з такім жа прыкладна позіркам адразу чатырох пар жаночых вачэй. У іншамарцы, відаць, ехала ўся жаночая частка сям'і: бабуля, маці, унучка з малой дачкой. Розныя па ўзросце, яны паглядзелі на мяне амаль аднолькава. А ўнучка, што была за рулём, нават паспрабавала неяк мяне яшчэ і аб'ехаць — гэта на нашым і без таго нешырокім завулку... Відавочна, гарадскія ехалі. У той момант я ўганяў у дошку чарговы цвік: мы з братам перараблівалі агароджу...**

«Вядома, ты іх здзівіў. Сёння ж ужо амаль ніхто цвікі не выкарыстоўвае. Усё на шрубах!» — жартам пракаментаваў сітуацыю брат. Ну, тое праўда. Выраз «убіць цвік» фактычна страціў актуальнасць. Цяпер трэба перфаратар, каб потым была магчымасць укруціць той самы вышэйузгаданы шруб. Тут, дарэчы, можна прыгадаць анекдот. Жонка завіхаецца па гаспадарцы, а сужэнец яе ў гэты час на канапе з газетай ляжыць, тэлевізар глядзіць. Жонка глядзела, глядзела на тое, потым не вытрымала і кажа: «Ты хаця б смецце вынес!» А той адказвае: «А гэта не мужчынская работа!» Жонка тут жа пачынае расшпільваць халацік: «Добра, рабі тады сваю мужчынскую работу!» Паўза... «Ну, дзе там тое смецце?» — перапытвае муж... Але ж я пра іншае. Як падалося, сёння дзяўчыну можна калі не зацікавіць, дык здзівіць тым, што ты ўмееш трымаць у руках просты малаток. Пабочны, так бы мовіць, эфект нашага лічбавага і мабільнага жыцця. Як той казаў, няма таго, што раней было: каб разбірацца ў гаджэтах, малаток сапраўды не патрэбны.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Не чакаючы цёплага надвор'я, нашы дзяўчаты і жанчыны традыцыйна не сталі прасіць (калі тое было?) міласці ад прыроды — рашуча перайшлі на міні. Там доўгія ножкі, тут аголеныя каленкі... І паўсюдна — шпількі... Яшчэ крыху, і адкрыецца дадатковы «партал» — глыбокі выраз. Даўно адпрацаваны спосаб злавіць зацікаўленыя мужчынскія позіркі. Але ж дзейнічае: і ловяць, і будуць лавіць. Ва ўсіх узростах. Як некалі казала гераіня Клары Новікавай: «Бусики — чтобы велись дедусики». Што і казаць: вечныя каштоўнасці...

Яшчэ адзін адпрацаваны і літаральна адшліфаваны ад пастаяннага карыстання спосаб — я не такі! Яму, калі памятаеце, вядомы Сямён Слепакоў нават цэлую песню прысвяціў пад назвай «Тайна аб усіх мужчынах»: «Все мужчины изменяют своим жёнам, а я не такой, я не такой, я не такой, именно я, именно я, я не такой!.. Они все такие, я у тебя один не такой!» Сутнасць спосабу ў тым, што ты выдаеш сябе за трохі іншага, вядома, лепшага, чым ёсць насамрэч. Гэта як быццам бы і не падман. Так, хітрык невялікі. Памятаю, да нас адзін час часта бегаў сусед — студэнт Лёня, які жыў на здымнай кватэры. Кожны раз, калі да яго прыходзіла дзяўчына, ён звяртаўся да нас — па штопар. Гэта адбывалася настолькі рэгулярна, што міжволі ўзнікла думка, што справа — зусім не ў штопары. Кшталту: «Вой, а ў мяне штопара няма... Але дзеля такога выпадку... Ты не хвалюйся, я зараз абавязкова нешта прыдумаю і ўсё вырашу». Галоўнае, каб гэты хітрык аказаўся без глабальных наступстваў. Гэта ўжо як у чарговых анекдотах на тэму. Пачынаецца з аб'явы — «Пазнаёмлюся з разумнай дзяўчынай для заняткаў глупствамі». А заканчваецца... Адна бландзінка скардзіцца другой. «Ты не ўяўляеш, як мне не шанцуе! Пяты сужэнец — і зноў раганосец!» Таму, каб такога не было, часам лепш скарыстацца своеасаблівай парадай ад расійскай каманды «25-я» з Вышэйшай лігі Клуба вясёлых і знаходлівых: «Ну што, да цябе?» — пытаецца хлопец у дзяўчыны пасля знаёмства. — «У Варонеж?» — «А ты ўмееш адшываць!»

